WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

18 жніўня 2011 г.
ЧАЦВЕР
№ 156 (27020)
Кошт 700 рублёў

Аляксандр ЯКАБСОН:

## «Многія кіраўнікі проста баяцца тэмы імпартазамяшчэння»

**Учора адбылося пасяджэнне калегіі Камітэта дзяржаўнага кантролю. Былі прааналізаваны сітуацыя з імпартнымі закупкамі і захады, накіраваныя на змяншэнне залежнасці ад імпарту.**

У 2010 годзе ў краіне не выкананы параметры прагнозу знешняга гандлю таварамі і паслугамі. Не змаглі забяспечыць рост экспарту Міністэрства будаўніцтва і архітэктуры, канцэрны «Белнафтахім», «Беллегпрам» і іншыя. Перавысілі прагноз па імпарце Міністэрства прамысловасці, Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, канцэрн «Белдзяржхарчпрам»...

У першым паўгоддзі 2011 года тэмпы росту экспарту перавысілі тэмпы росту імпарту і склалі 162,3 працэнта і 153,6 працэнта адпаведна. Аднак гэты вынік, хутчэй, абумоўлены не аптымізацыяй імпарту, а сітуацыяй на валютным рынку.

Залежнасць эканомікі ад імпарту захоўваецца: амаль адна трэцяя частка выдаткаў на выраб прадукцыі — гэта імпартныя сыравіна, матэрыялы, камплектныя часткі і паліва.

Праца над імпартазамяшчэннем увесь час знаходзіцца ў полі зроку Камітэта дзяржкантролю. «Неаднаразова праводзіліся калегіі па гэтых пытаннях. На жаль, належнай аддачы ад органаў дзяржкіравання, аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама пакуль няма, — заявіў Валянцін Патаповіч, начальнік галоўнага ўпраўлення Камітэта дзяржаўнага кантролю. — Мы мала робім для таго, каб неяк адысці ад імпартных закупак. Таму на гэтай калегіі мы зноў закранаем гэтыя пытанні. Адна маштабная калегія ўжо была ў 2008 годзе ў Гомелі. Там камітэт выказаў шэраг канкрэтных прапаноў, але вялікіх зрухаў так і не адбылося».

Старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Аляксандр Якабсон назваў праблемы з імпартазамяшчэннем «нашымі хранічнымі хваробамі». «Многія кіраўнікі проста баяцца гэтай тэмы, — сказаў ён. — У апошняй паездцы па краіне я зразумеў, што ў нас кадры не абцяжараны проста гэтай праблемай». Чыноўнік распавёў пра візіт у адзін з раёнаў. Там ён пабываў на мясцовым хлебазаводзе. «Будавалі з разлікам магутнасці ў сорак сем тон хлеба ў суткі, а выдае ён цяпер толькі сем тон, — канстатаваў Аляксандр Якабсон. — Вялізныя плошчы застаюцца пустымі. У цэхах ужо даўно трэба было размясціць якую-небудзь вытворчасць. Рэнтабельнасці ніякай. А дырэктар на пытанне, ці ведае ён што-небудзь пра план па экспарце прадукцыі, адказаў адмоўна».

СТАР. 2

## МАЗ прэзентаваў прынцыпова новую мадэль — грузавік з капотнай кампаноўкай рухавіка



**МІНСКІ АЎТАМАБІЛЬНЫ ЗАВОД учора прэзентаваў журналістам першы доследны экзэмпляр новай мадэлі грузавіка з капотнай кампаноўкай рухавіка — МАЗ-6440. Гэта мадэль была распрацавана канструктарамі і дызайнерамі прадпрыемства ўсяго толькі за год, што, як адзначыў гендырэктар МАЗа, вельмі і вельмі сціслыя тэрміны.**

— Я сам ваджу машыну шмат гадоў, таму ўчора-пазаўчора сеў за руль «капотніка» і праехаў па тэрыторыі завода з прычэпам. Паверце мне, я ехаў, як у «Жыгулях» — усё мякка ідзе і салон адчуваецца, — прызнаўся **Аляксандр БАРОЎСКІ, генеральны дырэктар МАЗа**. — За мной такі вялікі прычэп едзе, але я гэтага не адчуў. Гэта сапраўды новы напрамак у будаўніцтве машын, я лічу, што гэта гонар для МАЗа. І наогул, МАЗ павінен здзіўляць не толькі Беларусь, але ўвесь аўтамабільны свет сваімі навінкамі. Што мы і спрабуем зрабіць.

У доследным экзэмпляры ўсталяваны рухавік Мінскага маторнага завода магутнасцю 600 конскіх сіл, які адпавядае экалагічнаму стандарту ЕЎРА-4. Даўжыня аўтапоезда (прэзентаваны сядзельны цягач быў у счэпцы з паўпрычэпам МАЗ-975830) складае 18,45 метра і такім чынам не перавышае дапушчальныя ў Рэспубліцы Беларусь габарыты. На аўтамабілі ўсталяваныя круіз-кантроль, лічбавы тахограф, электрападʼёмнік люка кабіны, люстэркі з электракіраваннем і электрападагрэвам, кліматычная ўстаноўка з электрапрывадам засланак, сістэма курсавой устойлівасці, абаронныя рашоткі галаўных фар, кандыцыянер, сядзенні павышанай камфортнасці, халадзільнік, падсветка падножак уваходу ў кабіну, ёсць два спальныя месцы. Да канца года прэзентаваны экзэмпляр МАЗаўскага «капотніка» будзе знаходзіцца ў доследнай эксплуатацыі, а толькі пасля будзе запушчаны ў серыйную вытворчасць. Як перакананы гендырэктар МАЗа, попыт на яго будзе і ў Беларусі, і ў іншых краінах — перш за ўсё ў Расійскай Федэрацыі.

У сваю чаргу **Дзмітрый КАРАТКЕВІЧ, намеснік гендырэктара МАЗа па тэхнічным развіцці**, дадаў, што капотны аўтамабіль мае шэраг бясспрэчных пераваг перад безкапотнымі: гэта і эрганоміка працоўнага месца кіроўцы (больш нізкая кабіна, роўная падлога, магчымасць устаць у поўны рост), і пасіўная бяспека (бо перад кіроўцам знаходзіцца 1,5 метра «жалеза» ў якасці барʼера), і іншыя інавацыйныя рэчы, якія былі закладзены ў гэты аўтамабіль.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

Кватэрнае пытанне

## ЗАЯВУ ПАДАЦЬ МОЖНА

**Я стаю ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў толькі па месцы працы. Але наша арганізацыя цяпер у складаным фінансавым становішчы і не можа аказаць дапамогу ў будаўніцтве жылля. Ці магу я атрымаць субсідыю на будаўніцтва кватэры ў выканкаме па месцы жыхарства?**

**В. БЕЛЫ**, *г. Орша.*

У адпаведнасці з пунктам 5 Палажэння аб выдзяленні грамадзянам Рэспублікі Беларусь аднаразовых субсідый на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў (зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 красавіка 2002 г. № 555) грамадзяне, якія знаходзяцца на ўліку асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў толькі па месцы працы, маюць права падаць заяву на атрыманне субсідыі ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган, на тэрыторыі якога знаходзіцца арганізацыя, якая паставіла іх на ўлік, пры адсутнасці магчымасці атрымаць субсідыю па месцы працы. Разам з тым, гэта правіла не распаўсюджваецца на работнікаў, пастаўленых на ўлік па льготных падставах згодна з калектыўным дагаворам (напрыклад, пры забяспечанасці агульнай плошчай жылля ў памеры больш як 15 кв. метраў на аднаго члена сямʼі).

Субсідыі выдзяляюцца названым грамадзянам у парадку, прадугледжаным для тых, хто знаходзіцца на ўліку ў мясцовым выканаўчым і распарадчым органе, зыходзячы з часу прыняцця іх на ўлік асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў у арганізацыі.

Грамадзянам, якія маюць у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі права на пазачарговае атрыманне жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання, субсідыі выдзяляюцца ў парадку чарговасці, вызначанай для адпаведных катэгорый грамадзян, зыходзячы з часу прыняцця іх на ўлік асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў.

Прыём і ўлік заяў грамадзян на атрыманне субсідыі ажыццяўляюцца службамі субсідзіравання мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў і арганізацый. Заявы павінны быць разгледжаны імі ў месячны тэрмін.

**Віктар САВІЦКІ.**

## ВАДАЛАЗ — БРАКАНЬЕР

**Нарад Браслаўскага аддзялення «Ахова» ля вёскі Вязкі на беразе возера Дрывяты затрымаў вадалаза мясцовага «прадстаўніцтва» таварыства выратавання на водах, які з парушэннем адпаведнага заканадаўства здабываў рыбу.**

22-гадовы «падводны» рыбак «папаўся» ў «міліцэйскія сеткі» а сёмай гадзіне раніцы. Падлічылі, што ён прычыніў страту прыродзе ў памеры больш як 2,2 мільёна рублёў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

ISSN 1990 - 763X

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Минского райпо (продавец) проводит открытый аукцион по продаже объектов недвижимого имущества в составе:**

**Лот № 1:** здание магазина (инв. № 600/С-97332), об. пл. 81,3 кв.м, **Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, д. Котяги.**

**Начальная цена с НДС – 109 200 000 бел. руб.**

**Площадь земельного участка – 0,0536 га.**

**Лот № 2:** здание магазина (инв. № 600/С-104997), об. пл. 110,5 кв.м, **Минская обл., Минский р-н, Самохваловичский с/с, д. Мариполь.**

**Начальная цена с НДС – 94 800 000 бел. руб.**

**Площадь земельного участка – 0,0213 га.**

**Задаток 10% от начальной стоимости объекта (лота) перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Банк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

**Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.**

Аукцион состоится **20.09.2011 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 19.09.2011 до 17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.08.2011 г. (для б/н разлікаў) | | | | Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ | |
|---|---|---|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 5 015,00 | 1 чэшская крона | 295,32 | USD | 28,7207 |
| ▼ 1 еўра | 7 210,07 | 1 польскі злоты | 1740,41 | 10 UAH | 35,9009 |
| 1 латвійскі лат | 10 180,67 | ▼ 1 расійскі рубель | 174,61 | 10000 BYR | 57,2810 |
| 1 літоўскі літ | 2 091,20 | 1 украінская грыўня | 626,88 | EUR | 41,3061 |

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ПРОДАЖЫ ГАРЭЛКІ Ў СТУДЗЕНІ—ЛІПЕНІ ВЫРАСЛІ НА 11,6 ПРАЦЭНТА

**Паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.**

Праз рознічную сетку рэалізавана алкагольных напояў і піва на Br3976,1 млрд. У абсалютным алкаголі рэалізавана 6062,6 тыс. дал алкагольных напояў і піва.

### ПІВА ВЫРАБІЛІ І ЭКСПАРТАВАЛІ БОЛЬШ

**Піваварныя заводы краіны ў студзені—ліпені вырабілі 26 млн 900,8 тыс. дал піва, што на 20,7 працэнта больш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, паведамілі ў канцэрне «Белдзяржхарчпрам».**

Выпуск гэтай прадукцыі павялічылі «Піваварні Хайнекен» у Магілёўскай вобласці (на 44,9 працэнта), «Брэсцкае піва» (на 26,4 працэнта), сталічны «Піўзавод «Аліварыя» (на 25,7 працэнта), «Лідскае піва» (на 24,6 працэнта). Асноўны вытворца піва ў Беларусі — мінскае ААТ «Крыніца» — павялічыла выраб пеннага напою на 7,3 працэнта, давёўшы паказчык да 8 млн 939 тыс. дал. Разам з тым за тыя ж сем месяцаў года выпуск піва знізілі: «Дзвінскі бровар» з Віцебска (на 76,9 працэнта), філіял «Рэчыцапіва» «Піваварняў Хайнекен» (на 22,2 працэнта) і іншыя арганізацыі.

З пачатку года піваварныя заводы краіны павялічылі экспарт піва ў 1,43 раза ў параўнанні з паказчыкам адпаведнага перыяду мінулага года. За сем месяцаў сёлета было экспартавана 3 млн 875,8 тыс. дал піва.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ВІННЫЯ АФЕРЫ

**Жыхар Віцебска працуючы на фірме, якая займалася пастаўкай прадпрымальніцкім структурам віна, піва, вады, нядрэнна нажываўся на гэтых пастаўках.**

Розныя аферы ён ажыццяўляў раней, яшчэ калі быў індывідуальным прадпрымальнікам. Потым стаў працаваць начальнікам падраздзялення на фірме — пастаўшчыку прадукцыі. Заходзіў у кабінет да адказнай асобы і прасіў аформіць накладныя на адпраўку прадукцыі іншаму прадпрымальніку або прыватнай фірме, якія насамрэч раней супрацоўнічалі з бізнэс-структурай. У Расіі злодзей заказаў пячатку, якой карыстаўся пры афармленні неабходных папер пры ажыццяўленні хітрых здзелак. У выніку махлярствам і крадзяжом шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі ён зарабіў каля 82 мільёнаў рублёў.

Як паведаміла «Звяздзе» старшы памочнік пракурора Віцебскай вобласці Ірына Таўтын, махляра пазбавілі волі тэрмінам на пяць гадоў з канфіскацыяй маёмасці.

### ВЁЗ БЕЗ ДАКУМЕНТАЎ 16,6 ТОНЫ ТАМАТАЎ

Супрацоўнікі міліцыі на аўтамабільнай дарозе Мінск — Полацк недалёка ад Полацка вечарам затрымалі аўто «Даф», на якім жыхар Мінскага раёна вёз аж 16,6 тоны таматаў агульным коштам больш за 48 мільёнаў рублёў. Суправаджальных дакументаў на груз у кіроўцы не было. Склалі адміністрацыйны пратакол, а таматы канфіскавалі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

Ранняя дыягностыка

# Не запусціць меланому

**18-19 жніўня ў краіне праходзіць агульнарэспубліканская акцыя па ранняй дыягностыцы меланомы і раку скуры. Не пакідайце без увагі любыя змяненні на скуры, асабліва калі вы часта падстаўляеце скуру сонцу і рэдка карыстаецеся сонцаахоўнымі сродкамі. У сталічных установах аховы здароўя сёння і заўтра з 9.00 да 16.00 можна абследавацца на прадмет новаўтварэнняў. Звяртайцеся, калі ласка, як па месцы жыхарства, так і ў наступныя ўстановы.**

Партызанскі і Заводскі раёны: Мінскі гарадскі клінічны анкалагічны дыспансэр, 14-я, 17-я, 21-я, 22-я, 36-я паліклінікі, МСЧ «ММЗ» і «МАЗ», медпункт універмага «Беларусь»;

Маскоўскі раён: 25-я ЦРП, 5-я, 15-я, 25-я, 32-я паліклінікі, гарадскі клінічны скурна-венералагічны дыспансэр, ААТ «Галантэя»;

Фрунзенскі раён: 2-я ЦРП, 10-я, 12-я, 20-я, 26-я, 31-я паліклінікі, амбулаторыя Сухарава, раддом №2, ААТ «Сукно»;

Кастрычніцкі раён: 3-я ЦРП, 29-я, 35-я паліклінікі, амбулаторыя «Сокал», гінекалагічная бальніца, ААТ «Керамін»;

Ленінскі раён: 6-я ЦРП, 7-я, 10-я, 11-я, 18-я, 23-я, 37-я паліклінікі, амбулаторыя «Лошыца», ААТ «Камунарка», ААТ «Элема»;

Цэнтральны раён: 1-я ЦРП, 4-я, 16-я паліклінікі, МСЧ «Атлант»;

Савецкі раён: 34-я ЦРП, 13-я, 30-я, 33-я, 34-я паліклінікі, жаночая кансультацыя, медпункт прадпрыемства «Камароўскі рынак»;

Першамайскі раён: 19-я ЦРП, 8-я, 19-я, 27-я, 28-я паліклінікі, жаночая кансультацыя, МСЧ завода імя Вавілава.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

Минский городской центр недвижимости

## Извещение о проведении 29.08.2011 повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Минский фарфоровый завод»

| Номер предмета торгов | 1 | 2 |
|---|---|---|
| Наименование (назначение) и характеристики продаваемого имущества | Производственный корпус № 3 (производственное помещение) общей площадью 3230,8 кв.м, инвентарный номер 500/D-707995487 | Административное помещение общей площадью 72,3 кв.м, инвентарный номер 500/D-707952701 |
| Местонахождение продаваемого имущества | г. Минск, ул. Кропоткина, 91, пом. 2 | г. Минск, ул. Кропоткина, 91, кв. 13 |
| Собственник (продавец) | ОАО «Минский фарфоровый завод», ул. Кропоткина, 91, 220030, г. Минск | |
| Организатор аукциона | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефон (017) 227 48 36 | |
| Начальная цена предмета торгов с учетом НДС | 11 098 300 000 белорусских рублей | 369 112 000 белорусских рублей |
| Сумма задатка | 1 109 830 000 белорусских рублей | 36 911 200 белорусских рублей |

Торги проводятся в соответствии с порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Минский фарфоровый завод», утвержденным организатором аукциона. К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявку на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Банк», г. Минск, код 153001369, получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583 в срок по 26.08.2011 включительно.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый предмет торгов. Минимальная величина первого шага составляет пять процентов начальной цены предмета торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)», возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется победителем торгов (покупателем).

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 7 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Аукцион состоится **29 августа 2011 года в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 19.08.2011 по 26.08.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (в пятницу – до 13.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости»;**
**(029) 386 39 40 – ОАО «Минский фарфоровый завод.**

Минский городской центр недвижимости

## Извещение о проведении 19 сентября 2011 года открытого аукциона по продаже недвижимого имущества ОАО «Автомагистраль»

| | |
|---|---|
| Предмет торгов (наименование и характеристики продаваемого имущества) | - незавершенное строительством законсервированное здание склада ПСС и соли (арочник)(готовность 70%) (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) общей площадью 907,9 кв.м, инвентарный номер 630/U-62514 |
| Сведения о земельном участке | Кадастровый номер 623850100002003887, площадь – 0,3400 га, назначение – земельный участок для содержания и обслуживания незавершенного законсервированного капитального строения склада ПСС и соли |
| Местонахождение продаваемого имущества | Минская область, Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Вередовская, 6б |
| Сведения о продавце | ОАО «Автомагистраль», ул. Кижеватова, д. 8, 220099, г. Минск |
| Сведения об организаторе аукциона | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск |
| Начальная цена предмета торгов с учетом НДС | 504 068 400 белорусских рублей |
| Минимальная цена предмета торгов с учетом НДС | 100 813 680 белорусских рублей |
| Сумма задатка | 50 400 000 белорусских рублей |

Торги проводятся в соответствии с порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Автомагистраль», утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Банк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583.

Победитель торгов определяется аукционной комиссией в соответствии с порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Аукцион состоится **19 сентября 2011 года** в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 19.08.2011 по 16.09.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 17.00 (в пятницу – до 13.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 227 48 36, (017) 212 50 62.**

# «Многія кіраўнікі проста баяцца тэмы імпартазамяшчэння»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Як сказаў Валянцін Патаповіч, прыклады неналежнай працы над імпартазамяшчэннем ёсць у кожным міністэрстве, канцэрне. Гэта можа быць недастатковая прапрацоўка праектаў, неканкурэнтаздольнасць нашых імпартазамяшчальных тавараў. «Вось праект на заводзе «Віцязь»: медыцынскі стэрылізатар. Дык ён жа амаль у сем разоў даражэйшы за расійскі», — паведаміў начальнік галоўнага ўпраўлення Камітэта дзяржкантролю. Яшчэ адзін прыклад, звязаны з адсутнасцю ўзаемадзеяння паміж Міністэрствам будаўніцтва і архітэктуры і Белнафтахімам. Аказалася незапатрабаванай імпартазамяшчальная прадукцыя ААТ «Гродзенскі механічны завод» — паўпрычэп-цыстэрна для перавозкі цэменту аб'ёмам 28 м³. Замест яго закупляецца ўкраінская цыстэрна-цэментавоз аб'ёмам 21 м³. А можна было б пазбегнуць імпарту і зэканоміць 7 млн долараў.

Аляксандр Якабсон таксама засяродзіў увагу на сітуацыі ў свабодных эканамічных зонах: «Мэта стварэння гэтых зон — працаваць на экспарт. Але за першае паўгоддзе сальда знешняга гандлю па свабодных эканамічных зонах у цэлым склалася адмоўнае — каля 60 мільёнаў долараў ЗША. Мы саму ідэю свабодных эканамічных зон закопваем».

Па словах Валянціна Патаповіча, за дзесяць гадоў у нас адмоўнае сальда вырасла амаль у 10 разоў. У Беларусі пятнаццаць тысяч імпарцёраў. Столькі ж мы маем экспарцёраў, але гэтага мала. «Патрэбна залатое сячэнне: знайсці тое, што трэба ўвозіць, і тое, што мы можам вырабляць. Наша калегія не шукае і не карае. Гэта мы даверым адпаведным органам дзяржкіравання. Але працу над імпартазамяшчэннем трэба працягваць», — заявіў прадстаўнік дзяржкантролю. А старшыня Камітэта дадаў, што вырашэнне гэтай праблемы вельмі важнае, бо пасля ўсё адлюстроўваецца на спажывецкім рынку.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## «БЕЛАРУСНАФТА» ПАЦВЯРДЖАЕ ВЫХАД З ПРАЕКТА ПА ЗДАБЫЧЫ НАФТЫ Ў ІРАНЕ

У ходзе работ былі выяўлены новыя звесткі аб геалагічнай будове радовішча, што абумовіла змяненне тэхнічных і фінансава-эканамічных умоў рэалізацыі праекта. Улічваючы гэта, прадпрыемства «Беларуснафта» прыняло рашэнне аб выхадзе з гэтага кантракта пасля першага этапу. Магчымасць спынення выканання кантракта пасля заканчэння любога з этапаў была прадугледжана ўмовамі кантракта.

**Сакратарыят Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне галоўнаму спецыялісту аддзела па забеспячэнні работы Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Бураму Уладзіміру Васільевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

**РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку» смуткуе ў сувязі са смерцю начальніка аддзела кадраў выдавецтва Пальчыка Мікалая Іванавіча і выказвае глыбокае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.**

## ОАО «БЕЛТРУБОПРОВОДСТРОЙ»

Извещает своих акционеров, что 2-ая выплата дивидендов по итогам финансово-хозяйственной деятельности за 2010 год будет осуществляться по адресу: **г. Минск, ул. Богдановича, 129 и почтовыми переводами.**

**Справки по тел.: (017) 334 30 31, 334 34 74.**

УНП 100364117

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 30 сентября 2011 года проводит 15-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Год выпуска | Наработка в м/ч (износ) | Начальная цена продажи (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 119 | Хоппер-дозатор № 53073136, 4 кат., КР-1998 г. | г. Жодино, в/ч 18662 | 1977 | 90 | 21 000 000 | 2 100 000 |
| 120 | Хоппер-дозатор № 53073144, 4 кат., КР-1999 г. | г. Жодино, в/ч 18662 | 1977 | 90 | 21 000 000 | 2 100 000 |
| 121 | Хоппер-дозатор № 53072880, 4 кат., КР-1998 г. | г. Жодино, в/ч 18662 | 1977 | 90 | 21 000 000 | 2 100 000 |
| 122 | Хоппер-дозатор № 53072823, 4 кат., КР-1998 г. | г. Жодино, в/ч 18662 | 1977 | 90 | 21 000 000 | 2 100 000 |
| 123 | Хоппер-дозатор № 53072616, 4 кат., КР-1998 г. | г. Жодино, в/ч 18662 | 1977 | 90 | 21 000 000 | 2 100 000 |
| 124 | Хоппер-дозатор № 53072633, 4 кат., КР-1998 г. | г. Жодино, в/ч 18662 | 1977 | 90 | 21 000 000 | 2 100 000 |
| 125 | Хоппер-дозатор № 53072724, 4 кат., КР-1998 г. | г. Жодино, в/ч 18662 | 1977 | 90 | 21 000 000 | 2 100 000 |
| 126 | Хоппер-дозатор № 53072716, 4 кат., КР-1998 г. | г. Жодино, в/ч 18662 | 1977 | 90 | 21 000 000 | 2 100 000 |
| 127 | Хоппер-дозатор № 53072708, 4 кат., КР-1998 г. | г. Жодино, в/ч 18662 | 1977 | 90 | 21 000 000 | 2 100 000 |
| 128 | Хоппер-дозатор № 53073185, 4 кат., КР-1999 г. | г. Жодино, в/ч 18662 | 1977 | 90 | 21 000 000 | 2 100 000 |
| 129 | Хоппер-дозатор № 53072971, 4 кат., КР-1999 г. | г. Жодино, в/ч 18662 | 1977 | 90 | 21 000 000 | 2 100 000 |
| 130 | Четырехосный вагон-самосвал (думкар) № 55631592, 4 кат., КР-2001 г. | г. Жодино, в/ч 18662 | 1976 | 90 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 131 | Четырехосный вагон-самосвал (думкар) № 55632194, 4 кат., КР-1998 г. | г. Жодино, в/ч 18662 | 1972 | 90 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 132 | Четырехосный вагон-самосвал (думкар) № 55632343, 4 кат., КР-1998 г. | г. Жодино, в/ч 18662 | 1972 | 90 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 133 | Четырехосный вагон-самосвал (думкар) № 55632418, 4 кат., КР-1998 г. | г. Жодино, в/ч 18662 | 1976 | 90 | 30 000 000 | 3 000 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, в 11.00 **30 сентября 2011 г.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительные и другие необходимые документы до 17.00 **27 сентября 2011 г.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи **30 сентября 2011 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 10-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029, в Центре банковских услуг № 701 ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 278 06 97, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**

## Абзац

**◢ Гаспадаркі Беларусі пераадолелі сямімільённы рубеж на малацьбе збожжа. На раніцу 17 жніўня ўсяго гаспадаркі намалацілі 7 млн 101,8 тыс. тон збожжа пры сярэдняй ураджайнасці 34,9 ц/га. У Брэсцкай вобласці сабралі 1 млн 9,1 тыс. тон збожжа, Віцебскай — 1 млн 110,3 тыс. тон, Гомельскай — 816,4 тыс. тон, Гродзенскай — 1 млн 333,5 тыс. тон, Мінскай — 1 млн 796,5 тыс. тон, Магілёўскай — 1 млн 36 тыс. тон. Харчовага збожжа дзяржаве прададзена 836,5 тыс. тон, што складае 81,6 працэнта дзяржзаказу.**

◢ У Беларусі натуральны прырост насельніцтва за першае паўгоддзе гэтага года зафіксаваны ў 39 са 112 гарадоў (35 працэнтаў), у 17 з 93 пасёлкаў гарадскога тыпу (18 працэнтаў). У студзені—чэрвені гэтага года колькасць народжаных кампенсавала колькасць памерлых у 2 гарадах і 3 пасёлках гарадскога тыпу. Натуральны прырост сельскага насельніцтва адзначаўся толькі ў Мінскім раёне (264 чалавекі).

**◢ Адзенне з джынсавай тканіны не адпавядае дзелавому стылю, рэкамендаванаму для школьнікаў. Пра гэта паведаміла начальнік упраўлення адукацыі камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Зоя Хахлова на прэс-канферэнцыі ў мэрыі, прысвечанай пытанням падрыхтоўкі школ да новага навучальнага года.**

## Поўны абзац

◢ Васьмігадовы лебедзь-шыпун па мянушцы Швані, які жыве ва ўладальніка гасцініцы ў нямецкай адміністрацыйнай акрузе Мюнстэр, нарэшце кінуў спробы дамагчыся ўзаемнасці ад трактара свайго гаспадара. Разлюбіць сельскагаспадарчую машыну Швані дапамаглі ўкол вітамінаў і гуска, якая нядаўна пасялілася пры гатэлі.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

Галоўны трэнер нацыянальнай зборнай па хакеі Кары ХЕЙКІЛЯ:

# «Запрашэнне ў зборную Беларусі — ВЯЛІКІ ВЫКЛІК мне»

**УСЯГО тры дні, як у нацыянальнай зборнай па хакеі з'явіўся новы галоўны трэнер. Мы паведамлялі, што ім стаў фінскі спецыяліст Кары Хейкіля. Учора ён разам са старшынёй федэрацыі Яўгенам Ворсіным сустрэўся з журналістамі і растлумачыў, чаму выбраў Беларусь, у які хакей будзе гуляць наша каманда, і адказаў на пытанні пра асабістае.**


Кары ХЕЙКІЛЯ.

Спачатку **Яўген Ворсін** адкрыў амаль усе тайны пошуку і падпісання кантракту:

*— Гэты выбар нам няпроста было зрабіць: рынак кваліфікаваных спецыялістаў вялізны, тым часам многія зборныя вядуць працэс фарміравання каманд на алімпійскі 2014 год. Не будзь засяроджваць на фінансавым баку справы, адзначу толькі, што ўмовы, якія мы прапанавалі, — гэта еўрапейскія ўмовы. І мы атрымалі станоўчы адказ. Наш спіс прэтэндэнтаў не абмяжоўваўся вольнымі агентамі. Кола кандыдатаў было даволі шырокае, мы доўга, як бачыце, ўзважвалі ўсе «за» і «супраць». Мы ведалі, што пасля працы ў Магнітагорску Кары збіраўся адпачыць ад хакея нейкі час, тым не менш, зрабілі прапанову. Вось зараз мы трэці дзень кантактуем з хакеістамі, трэнерамі і спецыялістамі і прыйшлі да высновы, што Кары добра ведаюць у нашай краіне. Наш выбар ва ўсіх адносінах правільны.*

Кантракт падпісаны да чэмпіянату свету 2014 года. І на кожным этапе акрэслены вынікі. Мы не хаваем, што ў нас амбіцыйныя планы: на ўсіх чэмпіянатах свету мы павінны быць у васьмёрцы наймацнейшых. Прычым спачатку агаворана месца з 1 па 8, далей — з 1 па 6. Кары пагадзіўся з задачай быць заўсёды ў васьмёрцы.

Пэўны карт-бланш новаму трэнерскаму штабу таксама прадугледжаны кантрактам:

*— На працягу 16 месяцаў ні адзін з бакоў не можа разарваць кантракт. Сёння мы ў рэйтынгу 11-я. А на Алімпіяду трапляюць каманды без кваліфікацыі да 9 месца ўключна. У нас пакуль вялікае адставанне ад 9-га месца. Але мы спадзяёмся выправіць сітуацыю, —* патлумачыў Яўген Ворсін.

Далей на пытанні адказаў **Кары Хейкіля**. Спецыяліст працаваў у расійскіх клубах КХЛ і авалодаў рускай мовай — разумеў журналістаў і адказваў на пытанні ён пераважна па-руску.

— Я вельмі задаволены. Пасля пяці гадоў працы ў расійскіх клубах гэтая прапанова — вялікі выклік мне. Сёння вось я сустракаўся з кіраўніцтвам Мінскага «Дынама», яго галоўным трэнерам і гульцамі. Я хачу сустрэцца з кожным беларускім гульцом. Праз два месяцы я буду дакладна ведаць, хто будзе гуляць у зборнай. А ў лютым нас чакае гульня супраць зборнай Швецыі.

***— Ці даўно вы атрымалі прапанову і ці доўга раздумвалі?***

— Тры месяцы таму ў нас быў першы кантакт з федэрацыяй. З таго часу дамаўляліся, якой будзе наша праца.

***— Кары, вы працавалі на клубным узроўні і не маеце вопыту работы са зборнымі...***

— Так, я разумею, што гэта іншая праца, іншыя праблемы. Галоўнае, што часу на падрыхтоўку амаль няма, графік гульняў і трэніровак вельмі шчыльны.

***— Хто будзе ў вашым трэнерскім штабе?***

— Трэнер варатароў, трэнер па фізпадрыхтоўцы, спецыяліст, які будзе займацца статыстыкай і відэа. І другі трэнер. Хутчэй за ўсё ім будзе Аляксандр Андрыеўскі.

***— Можаце назваць зараз, хто будзе гуляць у зборнай?***

— Ёсць 35 гульцоў, з кожным з якіх я маю намер сустрэцца. Пакуль мне цяжка сказаць, хто капітан, хто лідар.

***— На трэніроўках вам спатрэбіцца перакладчык?***

— Апошнім часам я імкнуся размаўляць па-руску. Калі ёсць словы, якія я не магу перакласці, у камандзе ёсць гульцы, якія размаўляюць па-англійску. Перакладчык мне не патрэбны.

***— Ці бачылі вы раней гульню зборнай Беларусі?***

— Па тэлевізары. Выдатна памятаю шайбу, якую прапусціў швед Сала ад вашай каманды.

***— У які хакей будзе гуляць зборная Беларусі?***

— Абарона — самы важны кампанент у камандзе. Яе лёгка паставіць. Будзем працаваць над гульнёй у большасці і меншасці. Але трэба памятаць, што ў нас няшмат часу. Трэба гуляць па простай сістэме. І глядзець, па якой сістэме гуляе «Дынама», дзе шмат гульцоў зборнай.

***— Адным з вашых трэнерскіх прынцыпаў з'яўляецца дысцыпліна...***

— Так, бо гэта камандны спорт, а не марафон. Кожны хакеіст павінен дакладна ведаць сваё месца і сваю ролю на пляцоўцы.

***— Доўгі час у нашай зборнай панаваў паўночнаамерыканскі вектар...***

— У кожнага трэнера свая сістэма. Кожны трэнер — іншы трэнер.

***— Як будзеце адчуваць сябе, калі давядзецца везці беларускую зборную на чэмпіянат свету ў Фінляндыю?***

— Я трэці фінскі трэнер, які працуе са зборнай іншай краіны... Калі прыйдзецца гуляць супраць Фінляндыі — вельмі складаная сітуацыя.

***— У нашай краіне да хакея асаблівая ўвага і асаблівыя патрабаванні. Вы адчуваеце адказнасць?***

— Я буду выконваць сумленна сваю працу. Спадзяюся, гэтага будзе дастаткова.

***— Дзе вы плануеце жыць?***

— У Мінску. Праўда, пакуль не вызначыўся, дзе дакладна. Жонка таксама прыедзе.

***— Раскажыце, калі ласка, пра вашу сям'ю.***

— У мяне двое дзяцей. Мой сын гуляў у хакей у юніёрскай зборнай Фінляндыі, калі яму было 16. Але ў яго былі праблемы са спінай, і ён не змог працягваць. Дачка была чэрлідарам, яны ездзілі на розныя спаборніцтвы ў Еўропе і нават станавіліся чэмпіёнамі. Сыну зараз 28, дачцэ — 22. У мяне ёсць жонка. І сабака — аўчарка Манна, ёй 8 гадоў.

***— Ці любіце вы рускую гарэлку?***

— Так, але няшмат.

***— Раскажыце пра вашы захапленні. Чым любіце займацца, што чытаеце?***

— Адно з маіх хобі — катанне на лыжах. Я шмат часу праводжу на свежым паветры, штодзень гадзіну-дзве гуляю з сабакам. Шмат чытаю кніг — розных. У мяне ёсць ліцэнзія пілота, праўда, ужо не сапраўдная. Як і большасць мужчын, мяне цікавяць самалёты, машыны, матацыклы...

***— Калі вы пакідалі расійскія клубы, балельшчыкі насілі вас на руках. Што трэба зрабіць, каб беларуская прыхільнікі хакея так да вас ставіліся?***

— Адказ просты — даць вынік. Толькі вось дасягнуць гэтага выніку няпроста.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

# БАТЭ: штурм «Штурма» адкладзены

**Пасля лёсавання, калі БАТЭ ў раўндзе плэй-оф трапіўся адзін з самых простых, на пагляд балельшчыкаў і спецыялістаў, супернік, мы чакалі толькі перамог. Ну хаця б дома. Але ўвечары ў аўторак барысаўчанам не ўдалося зрабіць такі задзел, які б не пакідаў пытанняў на матч праз тыдзень у Аўстрыі. БАТЭ — «Штурм» — 1:1.**

Памылка барысаўскіх абаронцаў прывяла да гола на 12-й хвіліне ў вароты Гутара. Аўстрыйцы пачалі ўмацоўваць абарону. Барысаўчане нейкі час прыходзілі ў сябе, але ў той жа час увесь першы тайм асцярожнічалі. Яно і зразумела: адразу некалі ключавых гульцоў не выйшла на поле ў гэтым матчы: Рэнан Брэсан адбывае дыскваліфікацыю, траўмаваны Ігар Шытаў, Дзмітрый Ліхтаровіч і Аляксандр Паўлаў, а Віталь Радзівонаў не набраў патрэбных кандыцый. Карацей, перакроенай аказалася ўся каманда. І трэба аддаць Віктару Ганчарэнку і яго падапечным належнае: у другім тайме была зусім іншая гульня. БАТЭ ўзяло ініцыятыву ў свае рукі, і атакі сталі атрымлівацца куды лепш. На 59-й хвіліне, пасля ўдару Багі са штрафнога, сербскі легіянер Сіміч галавой накіраваў мяч у сетку — 1:1. Напрыканцы матча БАТЭ меў усе шанцы перамагчы, чаго толькі вартыя промах Гардзейчука...

— У сучасным футболе памылкі дорага каштуюць. Футбол, у прынцыпе, з іх і складаецца. Выйграе той, хто менш памыляецца. Пасля прапушчанага гола наша задача ўскладнілася, але я задаволены тым, як мы на гэта адрэагавалі, гэта тычыцца ў большай ступені другога тайма. У першым прыходзілі ў сябе, — сказаў пасля матча Віктар Ганчарэнка, які не стаў апраўдваць гульню каманды адсутнасцю асноўных гульцоў. У той жа час трэнер узгадаў недахоп Брэсана і Паўлава, наракаў на нялепшыя кандыцыі Няхайчыка і Радзівонава:

— Хацелася б, каб мы больш разнастайна дзейнічалі наперадзе. Для гэтага нам не хапала Паўлава і Брэсана. Што да апошняга, то не ведаю, як на нашу просьбу адрэагуе УЕФА, але за дзве жоўтыя карткі даць дзве гульні дыскваліфікацыі гульцу, які ўпершыню выдалены, крыху сурова. Няхайчык? У яго шмат падзей у апошні час: чэмпіянат Еўропы, нацыянальная зборная, еўракубкі, чэмпіянат Беларусі. Калі ён усвядоміць, што, акрамя ўсяго гэтага, ёсць яшчэ і футбол, ён палепшыць сваю гульню.

Кадравымі перспектывамі ў матчы ў адказ, які пройдзе праз тыдзень, Віктар Ганчарэнка не парадаваў:

— Шытаў, хутчэй за ўсё, з'явіцца, з Брэсанам сітуацыя вядомая. Астатнія ў матчы ў адказ не згуляюць. Але я веру ў каманду, нічога іншага не застаецца.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**


## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ»
220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А**

**режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00, тел.: 227 52 36, 226 03 01**

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2005 по 2010 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

- ул. Захарова, д. 67, корп. 1, ул. Великоморская, д. 10, ул. Великоморская, д. 12, ул. Роменская, д. 5, ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 76, д. 78, пр. Рокоссовского, 80, пр-т Независимости, д. 168, корп. 1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, пр-т Независимости, д. 168, корп. 3, ул. Есенина, д. 30, ул. Есенина, д. 34, ул. Есенина, д. 36, д. 38, ул. Матусевича, д. 52 и др.

Лицензия № 02250/0264117 выдана Министерством архитектуры и строительства РБ 09.04.2007 года сроком на пять лет.

**Объединение осуществляет строительство объекта «Многоэтажные жилые дома №№ 1, 2 по генплану со встроенными помещениями административно-общественного назначения и гаражом-стоянкой № 3 по г/п в квартале ул. Щорса – пр. Дзержинского на земельном участке 2,0 га с установкой индивидуального источника теплоснабжения. Жилой дом № 2 по генплану». (1 пусковой комплекс).**

Свидетельство (удостоверение) № 500/962-2184 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него от 16 апреля 2010 г.

Земельный участок площадью 1,0046 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Здание 1 пускового комплекса жилого дома запроектировано из двух 13-этажных секций. Количество жилых помещений 1 пускового комплекса жилого дома – 120. Серия жилого дома – индивидуальная.

Начало строительства жилого дома – октябрь 2010 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию в соответствии с ПОС – декабрь 2012 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 03.05.2010 № 169-15/10 с дополнением № 387-15/11 от 14.06.2011.

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить на строительство квартир с № 268 по № 387.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений без учета выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет – 7 294 690 – для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Договор строительного подряда от 28.09.2010 № 25, генподрядчик – ОАО «Стройтрест № 1». Ожидаемый ввод 1 пускового комплекса жилого дома в эксплуатацию в соответствии с договором строительного подряда – март 2011 г.

Прием и регистрация заявлений на участие в долевом строительстве жилых помещений будет осуществляться со дня выхода проектной декларации в каб. 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

**Генеральный директор Е.И. Вовна**

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ»
220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А**

**режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00, тел.: 227 52 36, 226 03 01**

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2004 по 2010 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

- ул. Захарова, д. 63, ул. Захарова, д. 67, корп. 1, ул. Великоморская, д. 10, ул. Великоморская, д. 12, ул. Роменская, д. 5, ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 78, пр-т Рокоссовского, д. 76, пр. Рокоссовского, 80, ул. Филимонова, д. 14, пр-т Независимости, д. 168, корп. 1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, пр-т Независимости, д. 168, корп. 3, ул. Есенина, д. 30, ул. Есенина, д. 34, ул. Есенина, д. 36, д. 38, ул. Матусевича, д. 52 и др.

Лицензия № 02250/0264117 выдана Министерством архитектуры и строительства РБ 09.04.2007 года сроком на пять лет.

**Объединение осуществляет строительство объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-6. Жилой дом № 22 по генплану» в г. Минске.**

Свидетельство (удостоверение) № 500/451-3910 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него от 03 марта 2010 г.

Земельный участок площадью 0,1665 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Здание жилого дома запроектировано из трех секций, первая и вторая – 10-этажные, третья – 13-этажная. Количество жилых помещений жилого дома – 149. Серия жилого дома – индивидуальная.

Начало строительства – январь 2011 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию в соответствии с ПОС – июль 2012 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 30.06.2010 № 566-15/10.

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить на строительство квартир с № 1 по № 36.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений без учета выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет – 6 234 337 руб. – для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Договор строительного подряда от 01.11.2010 № 34с -11-2010, генподрядчик – ОАО « Стройтрест № 35».

Прием и регистрация заявлений на участие в долевом строительстве жилых помещений будет осуществляться со дня выхода проектной декларации в каб. 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

**Генеральный директор Е.И. Вовна**

# ПРА ГОДНУЮ СТАРАСЦЬ І ПРЫЁМНЫЯ СЕМ'І ДЛЯ СТАРЫХ

**На якую падтрымку і дапамогу з боку дзяржавы сёння можа разлічваць састарэлы грамадзянін? У першую чаргу гэта, вядома, пенсійнае забеспячэнне. Калі ў яго ўстаноўлена група інваліднасці, ён мае дадатковыя сацыяльныя гарантыі. Калі ж чалавек адносіцца да катэгорыі малазабяспечаных, тады ён мае права на адрасную дапамогу. Людзям, якія маюць патрэбу ў доглядзе, дапамозе і медыцынскім абслугоўванні, прадастаўляюцца розныя формы сацыяльнага абслугоўвання, у тым ліку — у стацыянарных умовах (дамах-інтэрнатах для састарэлых і інвалідаў).**

Усяго ў краіне сёння 74 такія ўстановы: 73 — у камунальнай уласнасці аблвыканкамаў і адна — у рэспубліканскай (інтэрнат для ветэранаў вайны і працы ў Ждановічах). Усе яны падраздзяляюцца на дамы-інтэрнаты агульнага тыпу (такіх у краіне 21), на дамы-інтэрнаты псіханеўралагічнага профілю (іх у нас 44) і на дзіцячыя дамы-інтэрнаты (для няпоўнагадовых з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця) — такіх устаноў у Беларусі 9.

Як бачым, псіханеўралагічных інтэрнатаў для дарослых удвая больш, чым няпрофільных, і гэтаму ёсць тлумачэнне: у свеце з года ў год павялічваецца колькасць псіхічных захворванняў. На жаль, не абмінула гэтая сумная тэндэнцыя і нашу краіну, таму некаторыя дамы-інтэрнаты агульнага тыпу прыйшлося перапрафіліраваць у псіханеўралагічныя (у прыватнасці, такая работа была праведзена ў Мінскай, Віцебскай і Гродзенскай абласцях).

## АД МЕСЯЦА ДА ШАСЦІ

Раней, пры Саюзе, інтэрнатаў агульнага тыпу было больш. Але з развіццём сістэмы сацыяльнага абслугоўвання, якая дзейнічае ў Беларусі апошнія 24 гады, іх колькасць скарацілася. Надомнае абслугоўванне дазволіла многім састарэлым людзям застацца пражываць у сваіх кватэрах, у звыклай для іх, камфортнай абстаноўцы.

— Так і павінна быць, — падкрэсліла **начальнік упраўлення стацыянарных устаноў сацыяльнага абслугоўвання і капітальнага будаўніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Марыя Аляксандраўна ГАРБАЦЭВІЧ**. — Перш чым перасяляць сталага чалавека ў інтэрнат, трэба прапанаваць яму надомнае абслугоўванне, даць яму права выбару. Як паказвае практыка, многім старым больш зручна заставацца ў сваёй хаце. Несумненна, для пэўнай катэгорыі людзей надомнага абслугоўвання недастаткова. Ім прапануюць аддзяленні кругласутачнага знаходжання, якія функцыянуюць пры тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва (усяго ў краіне 54 такія аддзяленні). У асноўным яны размяшчаюцца не вельмі далёка ад пастаяннага месца пражывання састарэлага чалавека, умовы там максімальна набліжаны да хатніх, што дазваляе яму адчуваць сябе больш камфортна. Знаходзіцца ў такіх аддзяленнях састарэлыя могуць да шасці месяцаў. Як правіла, яны перасяляюцца туды на асенне-зімовы перыяд, на час ацяпляльнага сезону. Зімой пастаянна паліць печку адзінокаму старому цяжка, а ў аддзяленні заўсёды цёпла, ды і сацыяльны работнік побач.

Для паўнаты карціны варта ўзгадаць яшчэ бальніцы (аддзяленні) сястрынскага догляду, якія адносяцца да сістэмы Міністэрства аховы здароўя, дзе састарэлыя грамадзяне таксама могуць атрымаць неабходную медыцынскую дапамогу і догляд.

## ХТО МОЖА ПРЭТЭНДАВАЦЬ НА МЕСЦА Ў ДОМЕ САСТАРЭЛЫХ?

— У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 565, які быў прыняты ў лістападзе 2005 года, усе жылыя памяшканні ў дамах-інтэрнатах адносяцца да спецыяльных жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду, — звярнула ўвагу Марыя Аляксандраўна, — а гэта значыць, што размеркаваннем у такія ўстановы займаюцца выключна дзяржаўныя органы сацыяльнай абароны.

Права на размяшчэнне ў дамах састарэлых маюць асобы, якія дасягнулі агульна вызначанага пенсійнага ўзросту (жанчыны — 55 гадоў, мужчыны — 60), а таксама інваліды I, II групы, якія страцілі часткова ці цалкам здольнасць да самаабслугоўвання, маюць патрэбу ў доглядзе, дапамозе, у бытавым і медыцынскім абслугоўванні.

Не апошнюю ролю пры вызначэнні неабходнасці накіравання і ўмоў размяшчэння ў доме састарэлых адыгрывае факт наяўнасці дзяцей.

— Безумоўна, у першую чаргу месца ў доме-інтэрнаце прадастаўляецца адзінокім грамадзянам, — адзначыла Марыя Гарбацэвіч, — бо ў нас ёсць Кодэкс аб шлюбе і сям'і, дзе прапісана, што працаздольныя дзеці абавязаны даглядаць сваіх бацькоў. Такім чынам, тыя састарэлыя людзі, у якіх няма працаздольных членаў сям'і, юрыдычных, ці іншых фізічных асоб, якія абавязаны іх даглядаць, маюць права на размяшчэнне ў доме-інтэрнаце бясплатна. Калі ж у старога чалавека ёсць каму дагледзець, тады размяшчэнне ў доме-інтэрнаце магчыма толькі на платнай аснове. Канкрэтная сума вагаецца ў залежнасці ад рэгіёна, але ў сярэднім па краіне складае больш за адзін мільён рублёў у месяц.

Зразумела, не ў кожнага састарэлага грамадзяніна пенсія дасягае такога памеру. Розніцу павінны кампенсаваць дзеці. Калі, напрыклад, пенсія складае 700 тысяч рублёў, то прыкладна столькі ў месяц трэба даплачваць сваякам. Улічыце яшчэ, што пэўны працэнт пенсіі пакідаецца чалавеку на асабістыя расходы.

— Мы ў сваёй працы сутыкаліся з сітуацыяй, калі працаздольныя дзеці размяшчаюць сваіх бацькоў у дом-інтэрнат, заключаюць дагавор на аплату за іх утрыманне, падпісваюць абавязацельствы, а літаральна праз два-тры месяцы прыпыняюць усе выплаты, і мы потым нідзе не можам іх адшукаць, каб спагнаць запазычанасць, — дадала начальнік упраўлення. — І што рабіць з тымі састарэлымі? Фармальна мы маем права іх адлічыць, але ж бываюць выпадкі, калі ў іх ужо і жылля няма (дзеці «паклапаціліся»). Беларусь — сацыяльна арыентаваная дзяржава, натуральна, ніхто на вуліцу чалавека не выкіне. У выніку з-за такіх няўдзячных безадказных дзяцей дзяржава нясе страты. Сумна, што падобныя сітуацыі здараюцца нават з заслужанымі пенсіянерамі, ветэранамі вайны і працы... Адзінае выйсце для спагнання запазычанасці — зварот у суд.

Праўда, такія выпадкі — адзінкавыя, дадала Марыя Аляксандраўна, большасць дзяцей усё ж выконвае ўзятыя на сябе абавязацельствы.

## ДЭ-ФАКТА І ДЭ-ЮРЭ

Куды больш цікавая сітуацыя, калі ў дом-інтэрнат адпраўляюцца састарэлыя, чые дзеці самі дасягнулі пенсійнага ці перадпенсійнага ўзросту. Скажам, грамадзянін, якому на момант заключэння дагавора было 59 гадоў і 11 месяцаў, змяшчае ў інтэрнат сваю 83-гадовую маці. Натуральна — на платнай аснове. Але праз месяц ён сам становіцца пенсіянерам і адпаведна атрымлівае права на бясплатнае ўтрыманне маці ў доме састарэлых, нягледзячы на тое, што пасля выхаду на пенсію ён працягвае працаваць, займацца індывідуальнай прадпрымальніцкай дзейнасцю і г.д. Дэ-факта ён застаўся працаздольным і поўным сіл, а дэ-юрэ — перайшоў у катэгорыю непрацаздольных.

— Мы цяпер вывучаем гэтае пытанне, — падзялілася планамі Марыя Аляксандраўна. — Мяркуем унесці змены ў заканадаўстве і выдаліць асоб, якія толькі дасягнулі пенсійнага ўзросту, самі не маюць патрэбы ў доглядзе, не з'яўляюцца інвалідамі I, II групы і працягваюць працаваць, з катэгорыі, якая мае права на бясплатнае



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ўтрыманне сваіх састарэлых бацькоў у дамах-інтэрнатах. Калі ты яшчэ ў стане працаваць, значыць, у стане і даглядаць сваіх старых.

## З ЧАГО ПАЧАЦЬ?

У першую чаргу састарэламу, які выказаў жаданне з'ехаць у дом-інтэрнат, трэба звярнуцца да свайго лечачага ўрача, які вызначыць яго стан здароўя. Пры кожнай паліклініцы працуе ўрачэбна-кансультацыйная камісія, якая павінна даць адпаведнае заключэнне: можа канкрэтны чалавек быць змешчаны ў такую ўстанову ці не.

Варта адзначыць, што, акрамя паказанняў, існуе і шэраг проціпаказанняў для змяшчэння ў доме састарэлых — у прыватнасці, анкалогія, адкрытая форма туберкулёзу, заразныя формы хвароб скуры, псіхічныя растройствы, венерычныя хваробы і інш. Інтэрнат — гэта месца агульнага пражывання, таму адзін член калектыву не павінен уяўляць пагрозы для здароўя іншых.

Часта дзеці імкнуцца адправіць бацькоў у дом-інтэрнат, каб скарыстацца нерухомай маёмасцю састарэлага. Напрыклад, у 90-гадовага чалавека дзеці самі ўжо выйшлі на пенсію і маюць жаданне адправіць бацьку ці маці ў інтэрнат, каб вырашыць сваё жыллёвае пытанне. А гаспадар квадратных метраў пераязджаць адмаўляецца. У такім выпадку на першае месца выходзіць менавіта жаданне самога састарэлага, пры ўмове, што чалавек застаецца ў цвярозым розуме і не пазбаўлены дзеяздольнасці. Сілком выправіць яго ў інтэрнат дзеці не могуць. Для таго, каб быць накіраваным у дом састарэлых, чалавек павінен асабіста напісаць заяву ў органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства. Зразумела: старым, якія пражываюць у сельскай мясцовасці, бывае цяжка выбрацца ў раён. Яны могуць скарыстацца дапамогай сваіх сацыяльных работнікаў, якія адвязуць заяву.

— Абавязковай умовай для размяшчэння чалавека ў дом-інтэрнат псіханеўралагічнага профілю з'яўляецца рашэнне суда аб прызнанні яго недзеяздольнасці, — далучылася да гутаркі **галоўны спецыяліст аддзела стацыянарных устаноў сацыяльнага абслугоўвання ўпраўлення стацыянарных устаноў сацыяльнага абслугоўвання і капітальнага будаўніцтва Жанна Анатольеўна КОЦІК**. — Пасля прызнання недзеяздольнасці яму прызначаецца апякун, які і звяртаецца з заявай аб размяшчэнні ў дом-інтэрнат. Бываюць выпадкі, калі сваякі не згаджаюцца выступаць у ролі апекуноў і гэтыя функцыі на сябе бяруць дзяржаўныя органы.

## «ЧАСОВАЯ ПЕРАДЫШКА»

Колькасць дамоў-інтэрнатаў для састарэлых і інвалідаў, якія ёсць сёння ў краіне, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны лічыць дастатковай.

— Да 2011 года мы рэалізоўвалі Праграму развіцця і аптымізацыі сеткі ўстаноў сацыяльнага абслугоўвання, у межах якой увялі значную колькасць новых месцаў у стацыянарных установах. Толькі летась былі адкрыты два новыя дамы-інтэрнаты, — патлумачыла Марыя Аляксандраўна. — Нам цяпер трэба развіваць іншыя формы сацыяльнага абслугоўвання. Такую задачу паставіў перад намі і кіраўнік краіны, бо дамы-інтэрнаты — усё ж занадта затратная форма ўтрымання для дзяржавы. Аддзяленні сацыяльнага абслугоўвання, надомнае абслугоўванне — гэта ўжо плюс, бо гэта значна менш затратныя формы. У заходніх краінах увогуле прынята, што дзяржава да клопатаў пра састарэлых «падключаецца» на самай апошняй стадыі, калі чалавек абсалютна нямоглы. У першую чаргу гэта адказнасць сям'і, у другую — адказнасць грамадства, і толькі потым — дзяржавы.

З мэтай развіцця новых формаў сацыяльнага абслугоўвання пастановай Савета Міністраў ад 8 чэрвеня 2011 года № 738 прадугледжана правядзенне сацыяльнага эксперыменту, скіраванага менавіта на ўкараненне новых формаў сацыяльнага абслугоўвання і прадастаўленне сацыяльных паслуг. Месца правядзення — Мінск, тэрмін правядзення — пяцігодка (з 2011-га па 2015-ты гады). Сутнасць эксперыменту — прадастаўленне сацыяльных паслуг на аснове дагавора аб пажыццёвым утрыманні (дагавора рэнты).

Прыклад з жыцця: маці расціла сына, сабе ва ўсім адмаўляла, толькі б сыночку было добра, а ён вырас і стаў алкаголікам, пакуль што знаходзіцца ў месцах пазбаўлення волі. Каму састарэлай жанчыне даверыць сваю старасць? Каб папярэдзіць магчымыя махінацыі з кватэрамі, састарэлым прапануюць на выбар — быць змешчаным у стацыянарную ўстанову ці застацца пражываць дома і пры гэтым атрымліваць неабходныя сацыяльныя паслугі, але сваю кватэру яны згодна з дагаворам павінны пакінуць дзяржаве. Дагаворам, апроч іншага, прадугледжана і пэўная сума рэнты, якую будзе штомесяц атрымліваць такі пенсіянер.

У перспектыве азначаная форма сацыяльнага абслугоўвання старых можа быць распаўсюджана і на абласныя цэнтры.

Апроч таго, цяпер на базе стацыянарных устаноў сацыяльнага абслугоўвання ўсіх тыпаў прадугледжана магчымасць кароткатэрміновага (да аднаго месяца) знаходжання састарэлых асоб і інвалідаў на платнай аснове.

— Часта ў дзяцей, у каго на руках састарэлыя бацькі, узнікае неабходнасць ад'ехаць на пэўны час, скажам, у адпачынак, зрабіць рамонт ці легчы ў бальніцу, а перадаручыць клопаты пра старога няма каму, — расказала Жанна Анатольеўна. — Раней заканадаўствам дазвалялася змяшчаць такіх людзей у стацыянарныя ўстановы тэрмінам ад месяца да шасці. А сваякам патрэбна ўсяго некалькі тыдняў. Цяпер ёсць выйсце. Заключаецца дагавор аб часовым знаходжанні, ажыццяўляецца аплата і — можна займацца сваімі неадкладнымі справамі. Мы разумеем гэтую форму, як часовую передышку. Кожны ж мае права на асабістае жыццё.

Як паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, комплекснай праграмай развіцця сацыяльнага абслугоўвання на 2011—2015 гады прадугледжана будаўніцтва дамоў-інтэрнатаў для састарэлых і інвалідаў малой умяшчальнасці і павышанай камфортнасці. А гэта значыць, што тыя дзеці, якія маюць большыя фінансавыя магчымасці, змогуць забяспечыць сваім бацькам больш камфортныя ўмовы пражывання.

З часам, магчыма, на Беларусі з'явяцца і прыёмныя сем'і для старых і інвалідаў (такая форма ўжо сёння актыўна развіваецца ў Расійскай Федэрацыі).

Чым больш разнастайнай будзе сацыяльнае абслугоўванне — тым прасцей будзе кожнаму састарэламу выбраць для сябе найбольш зручны варыянт, што абавязкова станоўча адаб'ецца на якасці жыцця. Старасць павінна быць годнай.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

ГОСУДАРСТВЕННЫЙ КОМИТЕТ ПО ИМУЩЕСТВУ
в дополнение к информационному сообщению о проведении 20 октября 2011 г. аукциона по продаже находящегося в республиканской собственности и хозяйственном ведении могилевского республиканского унитарного предприятия электроэнергетики «Могилевэнерго», предприятия как имущественного комплекса – филиала «Бобруйский завод древесноволокнистых плит», опубликованному в газете «Звязда» 19 июля 2011 г. № 134, сообщает.

**В здании главного корпуса предприятия (ул. Куйбышева, 29а/6, г. Бобруйск) находится встроенное изолированное помещение – защитное сооружение гражданской обороны, остаточной стоимостью на 1 января 2011 г. 13 729 842 рубля, которое в соответствии с распоряжением Президента Республики Беларусь от 19 июля 2011 г. № 181рп «О внесении дополнения в распоряжение Президента Республики Беларусь от 1 марта 2010 г. № 60рп» будет передано покупателю имущественного комплекса в безвозмездное пользование с условием сохранения целевого использования.**

УНП 100745627

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА
*(в дополнение к проектной декларации, опубликованной в газете «Звязда» № 88 от 14 мая 2011 г.)*

Строительство объекта «Многоквартирный жилой дом по генплану № 56 **со встроенными помещениями торгового назначения** и гараж-стоянкой в микрорайоне «Каменная Горка-5».

Следующие помещения с отделкой по проекту:
1. Продуктовый магазин – 402,2 $м^2$;
2. Торгово-офисный блок № 1– 43,0 $м^2$;
3. Салон красоты – 207,1 $м^2$;
4. Торгово-офисный блок № 2 – 84,9 $м^2$;
5. Торгово-офисный блок № 3 – 55,5 $м^2$;
6. Торгово-офисный блок № 4 – 55,5 $м^2$;
7. Торгово-офисный блок № 5 – 68,0 $м^2$;
8. Торгово-офисный блок № 6 – 68,0 $м^2$;
9. Торгово-офисный блок № 7 – 55,5 $м^2$;
10. Торгово-офисный блок № 8 – 55,5 $м^2$;
11. Торгово-офисный блок № 9 – 84,9 $м^2$;
12. Аптека – 65,6 $м^2$;
13. Торгово-офисный блок № 10 – 45,7 $м^2$;
14. Торгово-офисный блок № 11 – 133,9 $м^2$;
15. Промтоварный магазин – 402,2 $м^2$.

Цена 1 $м^2$ эквивалентна 2850 $ (долларов) по курсу НБ РБ на момент оплаты.

Система скидок.

Ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству можно в офисе ОАО «Белбуд» по ул. Восточной, 133, офис 1 или по телефонам: 237 29 50, 237 29 52, 237 29 53.

УНП 100794022

*ОАО «Белбуд»*

# БАЦЬКАМІ МОЖНА СТАЦЬ. НА КОНКУРСНАЙ АСНОВЕ

**ТРЫ сямейныя пары будуць змагацца за магчымасць стаць выхавацелямі ў дзіцячым доме сямейнага тыпу. Яго плануюць адкрыць у верасні ў Іўі.**

— Гэта першы дзіцячы дом сямейнага тыпу ў нашым горадзе,— расказвае **намеснік начальніка аддзела адукацыі Іўеўскага райвыканкама Вольга БАРКО**. — Яго адкрываюць па ініцыятыве старшыні Іўеўскага райвыканкама. Пад дзіцячы дом выдзелены добраўпарадкаваны двухпавярховы катэдж. У доме, у якім будзе жыць новая сям'я, зараз ідзе рамонт. Туды закупілі яшчэ не ўсё неабходнае, таму ў арганізацый і прадпрыемстваў ёсць магчымасць паўдзельнічаць у гэтай добрай справе.

У прынцыпе, у нашым раёне ёсць прыёмныя сем'і, але ў іх звычайна выхоўваецца ад аднаго да трох дзетак. Стварэнне такога дзіцячага дома дасць магчымасць нам дапамагчы большай колькасці дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў ці ўвогуле без іх. Каля дзесяці малых знойдуць сям'ю. Мы ж, са свайго боку, будзем старацца, каб у дзіцячы дом трапілі дзеці з нашага раёна. Раней мы вымушаны былі аддаваць нашых дзяцей у інтэрнатныя ўстановы іншых раёнаў. Цяпер жа іх змогуць наведваць сваякі — напрыклад, бабулі.

Што датычыцца бацькоў, то пакуль на ролю выхавальнікаў у новы дзіцячы дом сямейнага тыпу прэтэндуюць тры сям'і. Але, магчыма, кандыдатаў стане больш.

Зараз будучыя кандыдаты ў бацькі-выхавальнікі збіраюць неабходныя дакументы для таго, каб прыняць удзел ў конкурсе, які будзе праводзіць упраўленне адукацыі.

Стаць бацькамі-выхавальнікамі могуць як сямейныя пары, так і незамужнія жанчыны ва ўзросце ад 28 да 45 гадоў, якія маюць вышэйшую або сярэднюю спецыяльную адукацыю.

Агульная колькасць дзяцей у дзіцячым доме сямейнага тыпу, уключаючы родных, не павінна перавышаць 10 чалавек. Бацькам-выхавальнікам у Іўі прапануюцца камфортныя ўмовы працы (выдзяляецца жыллё, неабходнае абсталяванне, мэбля, мяккі інвентар, вылучаюцца сродкі на гаспадарчае абслугоўванне і іншыя выдаткі па нормах і тарыфах, якія дзейнічаюць на тэрыторыі раёна), годная аплата працы, прафесійная дапамога і падтрымка па пытаннях выхавання дзяцей з боку псіхолагаў і педагогаў, дапамога ў вырашэнні гаспадарчых пытанняў.

Час працы бацькам-выхавальнікам залічваецца ў агульны працоўны стаж, што гарантуе права на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне і пенсійнае забеспячэнне.

У тым выпадку, калі бацькамі-выхавальнікамі становіцца сямейная пара, працоўныя адносіны складаюцца з адным з бацькоў, у той час як другі можа працягваць працу па сваёй асноўнай спецыяльнасці. Аднак апеку і выхаванне дзяцей будуць ажыццяўляць абое.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Абмеркаванне

# ЛАЎРЭАТАЎ ПРЭМІІ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ Ў ГАЛІНЕ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА НАЗАВУЦЬ У ВЕРАСНІ

**На сайце www.premia-soyuz.ru працягваецца грамадскае абмеркаванне пяці намінантаў на прэмію Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва за 2011-2012 гады. Кожны ахвотны мае магчымасць пазнаёміцца з творамі-намінантамі, іх аўтарамі, а таксама пакінуць свой голас ці каментарый. Намінанты былі вызначаны яшчэ ў маі спецыяльным Экспертным саветам.**

Ужо ў верасні Экспертны савет падсумуе вынікі галасавання грамадскага абмеркавання, разгледзіць экспертныя заключэнні і вызначыць тры творы на прысуджэнне прэміі. Выніковае рашэнне аб прысуджэнні прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва прыме Вышэйшы Дзяржаўны Савет Саюзнай дзяржавы. Нагадаем прэтэндэнтаў, якія пакуль знаходзяцца ў роўных умовах.

## Ад Рэспублікі Беларусь:

— серыя жывапісных і графічных работ «Гісторыя і сучаснасць»; серыя графічных цыклаў «Высокае неба», «Радзіма касманаўтаў», «Паўночны марскі шлях», «Чарнобыль. Будні беларускія», «Час доўгіх нажоў»; графічныя серыі афортаў і літаграфій да кніг «Слова аб палку Ігаравым», «Аповесці» Васіля Быкава, «Яна і я» Янкі Купалы, «Выбранае» Якуба Коласа (аўтар — народны мастак Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, кавалер ордэна Дружбы народаў, член Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, член Расійскай акадэміі мастацтваў Георгій Паплаўскі).

Творы жывапісу, станкавай графікі і кніжнай ілюстрацыі Георгія Паплаўскага знаходзяцца ў музеях Беларусі, Расіі і іншых краін. Яго імем названа карцінная галерэя ў Бабруйску, якой аўтар перадаў каля 50 сваіх работ.

— спектакль «Вяселле» па А. Чэхаву ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы (аўтарскі калектыў — мастацкі кіраўнік студыі SounDrama, рэжысёр, музыкант, акцёр Уладзімір Панкоў, мастак-пастаноўшчык Максім Абрэзкаў, народны артыст Беларусі, вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, лаўрэат Дзяржаўных прэмій БССР і СССР Генадзь Гарбук, акцёр вышэйшай катэгорыі Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Ігар Дзянісаў, заслужаная артыстка Беларусі, вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Зінаіда Зубкова, народны артыст Беларусі, вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Мікалай Кірычэнка, народны артыст СССР і Беларусі, вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, кавалер ордэна Францыска Скарыны Генадзь Аўсяннікаў).

Студыю SounDrama — творчае аб'яднанне рэжысёраў, артыстаў, харэографаў, мастакоў, якія ў сваіх творах спалучаюць драму, харэаграфію і музыку — Уладзімір Панкоў стварыў у 2005 годзе. Іграе на многіх музычных інструментах, бярэ ўдзел у фальклорных фестывалях, мае вопыт музычнай імправізацыі.

## Ад Расійскай Федэрацыі:

— паэтычны цыкл «Беларускі сшытак», паэма «Чмель у аўтобусе», асобныя вершы 1969-1994 гадоў паэта, пісьменніка, члена Саюза пісьменнікаў Расіі, члена Акадэміі расійскай славеснасці Глеба Гарбоўскага.

У Глеба Гарбоўскага выйшла звыш 40 кніг паэзіі і прозы, незлічоная колькасць публікацый у альманахах, тэматычных зборніках і г.д. Шэраг вершаў напісана на Поўначы, Сахаліне, у Паволжы, Сібіры, за мяжой, у тым ліку ў нашым Віцебску, куды аўтар на працягу многіх гадоў выязджаў на доўгі час.

— канцэртныя праграмы ў межах аўтарскіх штогадовых фестываляў у Мінску (2006-2009 гг.), якія ўключаюць сумесныя выступленні беларускіх і расійскіх музыкантаў і выканаўцаў; выкананне твораў беларускіх і расійскіх кампазітараў (аўтар — народны артыст Расійскай Федэрацыі, народны артыст СССР Юрый Башмет).

З 2009 года Юрый Башмет удзяляе вялікую ўвагу навучанню таленавітай моладзі ў Мінску. Тут штогод праходзіць заснаваная ім Моладзевая музычная акадэмія.

— калекцыя Паўлавапасадскіх шаляў «Спадчына» (аўтарскі калектыў — галоўны мастак Паўлавапасадскай хусткавай мануфактуры, заслужаны мастак Расійскай Федэрацыі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі ў галіне літаратуры і мастацтва Віктар Зубрыцкі, мастак Паўлавапасадскай хусткавай мануфактуры, заслужаны мастак Расійскай Федэрацыі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі ў галіне літаратуры і мастацтва Ірына Дадонава, мастак Паўлавапасадскай хусткавай мануфактуры, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі ў галіне літаратуры і мастацтва Алена Жукава, мастак-тэхнолаг Паўлавапасадскай хусткавай мануфактуры, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі ў галіне літаратуры і мастацтва, ганаровы работнік тэкстыльнай і лёгкай прамысловасці Уладзімір Стулаў, мастак Паўлавапасадскай хусткавай мануфактуры, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі ў галіне літаратуры і мастацтва Таццяна Сухарэўская, мастак Паўлавапасадскай хусткавай мануфактуры Алена Фаварытава, мастак Паўлавапасадскай хусткавай мануфактуры, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі ў галіне літаратуры і мастацтва Валерыя Фадзеева, мастак-стыліст Паўлавапасадскай хусткавай мануфактуры, заслужаны мастак Расійскай Федэрацыі Аляксандр Хопкін).

Віктар Зубрыцкі ажыццяўляў агульнае мастацкае кіраўніцтва і планаванне работ па стварэнні калекцыі паўлавапасадскіх шаляў «Спадчына» на аснове мастацкай традыцыі, якая існуе ўжо больш як паўтара стагоддзя.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

УНП 100262560.



# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ В ЖАБИНКОВСКОМ РАЙОНЕ БРЕСТСКОЙ ОБЛАСТИ

| Адрес участка/ кадастровый номер | Жабинковский с/с, д. Здитово, ул. Вишневая, 42 № 122580603601000159 | Жабинковский с/с, д. Здитово, ул. Вишневая, 44 № 122580603601000160 | Жабинковский с/с, д. Здитово, ул. Вишневая, 46 № 122580603601000161 | Жабинковский с/с, д. Здитово, ул. Вишневая, 55 № 122580603601000162 | Жабинковский с/с, д. Здитово, ул. Вишневая, 57 № 122580603601000163 |
|---|---|---|---|---|---|
| № лота | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| Начальная цена продажи (руб.) | 8 867 880 | 8 867 880 | 8 878 310 | 8 504 930 | 8 302 560 |
| Сумма задатка (руб.) | 886 000 | 886 000 | 887 000 | 850 000 | 830 000 |
| Расходы по подготовке зем.-кадастр. документации, гос. регистрации (руб.) | 844 835 | 678 549 | 662 175 | 678 549 | 678 549 |
| Общая площадь (га) | 0,1700 | 0,1700 | 0,1702 | 0,1639 | 0,1600 |
| Целевое назначение | для строительства и обслуживания жилого дома | | | | |
| Характеристика ограничений в использовании земли | водоохранная зона реки Мухавец на всей площади участков | | | | |
| Адрес участка/ кадастровый номер | Жабинковский с/с, д. Здитово, ул. Вишневая, 59 № 122580603601000164 | Жабинковский с/с, д. Здитово, ул. Жасминовая, 3 № 122580603601000167 | Жабинковский с/с, д. Здитово, ул. Васильковая, 4 № 122580603601000165 | Жабинковский с/с, д. Здитово, ул. Васильковая, 6 № 122580603601000166 | Ленинский с/с, д. Филипповичи, ул. Центральная, 29/1 № 122581504101000002 |
| № лота | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| Начальная цена продажи (руб.) | 8 577 580 | 8 837 040 | 9 272 920 | 8 427 100 | 3 510 370 |
| Сумма задатка (руб.) | 857 000 | 883 000 | 927 000 | 842 000 | 351 000 |
| Расходы по подготовке зем.-кадастр. документации, гос. регистрации (руб.) | 678 549 | 662 175 | 662 175 | 662 175 | 84 000 |
| Общая площадь (га) | 0,1653 | 0,1703 | 0,1787 | 0,1624 | 0,1564 |
| Целевое назначение | для строительства и обслуживания жилого дома | | | | |
| Характеристика ограничений в использовании земли | водоохранная зона реки Мухавец на всей площади участков | | | | 0,0008 га – охранная зона линии электропередач напр. до 1000 В |
| Условия продажи | ● осуществить в двухмесячный срок после принятия решения сельского исполнительного комитета о предоставлении земельного участка, государственную регистрацию права на него; ● получить в установленном порядке проектную документацию и разрешение на строительство жилого дома; ● приступить к освоению земельного участка в течение 1 года со дня получения свидетельства о государственной регистрации права на него | | | | |

**Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»**

**Перечень документов представляемый потенциальным участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; заверенную копию платежного поручения о внесении задатка; **гражданином –** копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина –** нотариально удостоверенная доверенность. При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. **Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Задаток в размере до 10% от начальной цены объекта перечисляется **КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012000002678 в филиале № 126 АСБ «Беларусбанк» г. Бреста, код 252, УНП 290433924**.

**Примечания: Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.** В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

**Победитель аукциона также обязан:** ● в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения сельского исполкома о предоставлении ему земельного участка осуществить оплату за аукционный объект и возместить расходы, понесенные бюджетом сельского исполкома по подготовке земельно-кадастровой документации; ● в течение 10 рабочих дней с даты принятия решения о предоставлении земельного участка возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.

**Аукцион состоится 22 сентября 2011 г. в 11.00 по адресу: г. Жабинка, ул. Кирова, 65 (зал заседаний).**
**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 18.08.11 г. до 17.30 16.09.11 г. по адресу: г. Брест, ул. Комсомольская, 46.**
**Контактные телефоны: 23 81 92, 23 18 13. Сайт: bgcn.by, city.brest.by**





*...Буслы ў людзей*
*Жыць навучаюцца —*
*Закон агульны*
*На крылах носяць:*

*Няхай у вырай*
*Заўтра збіраюцца,*
*Але сягоння*
*Дзяцей прыносяць!*





Мілую **Вераніку ХІЛЬКЕВІЧ** і ўсю яе вялікую прыгожую сям'ю шчыра вітаем з нараджэннем **дачушкі**! Хай расце здаровенькай! І гэткай жа абаяльнай разумніцай, як звяздоўцы мама і дзядуля!

**Сябры па працы.**



# 261 млн рублёў — за зямельны ўчастак

**У Мінскім гарадскім цэнтры нерухомасці прайшоў адкрыты аўкцыён па продажы зямельных участкаў у прыватную ўласнасць грамадзян Рэспублікі Беларусь.**

На таргі выстаўляліся 8 вакантных надзелаў плошчай па 5—7 сотак. Пяць з іх у Заводскім раёне на месцы існуючай жыллёвай забудовы і тры — у Цэнтральным раёне на месцы былой вёскі Цна. Стартавая цана зямельных участкаў вар'іравалася ад 218 да 265 млн рублёў.

Адзін з вакантных участкаў, размешчаны на вуліцы Фядотава, набыў за 261 млн рублёў (стартавая цана плюс 5%-ная надбаўка) жыхар сталіцы. На іншыя 7 пляцовак прэтэндэнтаў не знайшлося.

— Гэтыя ўчасткі будуць выстаўлены на таргі паўторна, — удакладнілі ў цэнтры нерухомасці. — Хутчэй за ўсё, наступны аўкцыён па продажы зямельных участкаў пройдзе да канца бягучага месяца.

**Наталля ВАВІЛАВА,**
*«Мінск—Навіны».*



**У суд Бабруйскага раёна і г. Бабруйска** пастуціла заява аб аб'яўленні памерлым **СТАЎРОВА Андрэя Уладзіміравіча**, 10 верасня 1977 года нараджэння, ураджэнца г. Бабруйска, Магілёўскай вобл., які пражываў па адрасе: Магілёўская вобл., г. Бабруйск, вул. Чаплыгіна, д. 35, кв. 24. Просім грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі пра Стаўрова Андрэя Уладзіміравіча, паведаміць іх суду Бабруйскага раёна і г. Бабруйска на адрас: г. Бабруйск, вул. Кастрычніцкая, д. 128, каб. 49, тэл. 52 50 15, 52 06 42 на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі.

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ
## о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в деревне Чёрный Лес Жодинского сельского исполнительного комитета Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2. | Дата, время и место проведения аукциона | 22 сентября 2011 года в 15.00, г. Жодино, пер. Молодежный, 3, Жодинский сельисполком, кабинет № 1 |
| 3. | Продавец и его адрес | Жодинский сельский исполнительный комитет, г. Жодино, пер. Молодежный, 3 |
| 4. | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | **Лот № 1** — земельный участок площадью 0,2500 га с кадастровым № 624881714801000016 в д. Чёрный Лес.<br>**Лот № 2** — земельный участок площадью 0,2374 га с кадастровым № 624881714801000017 в д. Чёрный Лес.<br>**Лот № 3** — земельный участок площадью 0,2230 га с кадастровым № 624881714801000018 в д. Чёрный Лес.<br>**Лот № 4** — земельный участок площадью 0,1214 га с кадастровым № 624881714801000019 в д. Чёрный Лес.<br>**Лот № 5** — земельный участок площадью 0,1390 га с кадастровым № 624881714801000020 в д. Чёрный Лес.<br>**Лот № 6** — земельный участок площадью 0,1317 га с кадастровым № 624881714801000021 в д. Чёрный Лес.<br>**Лот № 7** — земельный участок площадью 0,1251 га с кадастровым № 624881714801000022 в д. Чёрный Лес |
| 5. | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6. | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 7. | Начальная (стартовая) цена продажи | **Лот № 1** — 10 020 000 рублей. **Лот № 2** — 9 514 992 рубля; **Лот № 3** — 8 937 840 рублей. **Лот № 4** — 4 865 712 рублей; **Лот № 5** — 5 571 120 рублей. **Лот № 6** — 5 278 536 рублей; **Лот № 7** — 5 014 008 рублей. |
| 8. | Условия аукциона | - продажа по цене не ниже начальной;<br>- участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь |
| 9. | Наличие инженерной инфраструктуры | Проектная документация на строительство инженерных сетей электроснабжения |
| 10. | Условия оплаты | Безналичный расчет в течение 5-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11. | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка, р/с 3604627020009 в филиале № 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, ул. 50 лет Октября, 25 «А», код 812, УНП 600023532 (с пометкой «Задаток за земельный аукцион») |
| 12. | Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемым земельным участком | Каждый четверг в 15.00 |
| 13. | Окончательный срок приема заявлений | 16 сентября 2011 года до 17.00 |
| 14. | Контактные телефоны | 8 01775 35 449, 8 01775 37 174, 8 01775 37 189 |

**Расходы по организации и проведению аукциона** (Лот № 1 — 970 848 рублей; лоты №№ 2, 3, 4, 5, 6, 7 — по 970 847 рублей) **и затраты на публикацию информационного сообщения** подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Физическим лицам — документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, доверенность, заверенную нотариально (в случае, если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо).

Дыскусійная трыбуна

# ШВЕДСКІ ШЛЯХ ПРЫЦЯГАЛЬНЫ, АЛЕ...

**НА адным з расійскіх тэлеканалаў беларускі палітолаг паведаміў, што ў нас сацыяльная дзяржава і Беларусь выкарыстоўвае шведскі варыянт. З апошнім цяжка пагадзіцца.**

Пра «грамадства ўсеагульнага дабрабыту», якое склалася ў Швецыі, даводзілася шмат чытаць. А ці магла б Беларусь, як і іншыя краіны на постсавецкай прасторы, выбраць шведскі шлях развіцця?

Многія палітыкі лічаць, што шлях, якім ідзе Швецыя, з'яўляецца найбольш мяккім пераходам ад «дзікага» капіталізму да «дэмакратычнага» сацыялізму. Даволі прыцягальны варыянт развіцця, які прыйшоўся б па душы былым савецкім грамадзянам. Чым жа Швецыя адрозніваецца ад іншых краін свету? Самае важнае, што шведам удалося знайсці кампраміс паміж наёмнымі работнікамі і ўладальнікамі сродкаў вытворчасці — буржуазіяй. Гэты кансэнсус з'яўляецца, у пэўнай меры, стабілізуючым фактарам грамадства. І тут цікавы адзін момант. У Швецыі вельмі моцныя прафсаюзы, але кожны, хто ўступае ў прафсаюз, аўтаматычна становіцца членам сацыял-дэмакратычнай партыі, якая з невялікімі перапынкамі знаходзіцца ва ўладзе з 1932 года.

Класавы спакой у краіне захоўваецца дзякуючы сацыяльнай палітыцы, якую праводзіць дзяржава.

Наёмныя работнікі забяспечваюцца бясплатным жыллём, праўда, чарга на дзяржаўныя кватэры існуе. Медыцынская дапамога бясплатная, навучанне ў школах і ВНУ — таксама.

А што датычыцца пенсій і сацыяльнага забеспячэння, то Швецыя тут наперадзе ўсёй планеты. Пенсію па старасці (народную) атрымліваюць усе грамадзяне, якія дасягнулі 65 гадоў, і тут не мае значэння, ці працаваў чалавек, ці «лынды біў». А калі ў пенсіянера, акрамя пенсіі, няма ніякага даходу, то яму выплачваецца надбаўка ў памеры 48%. Акрамя звычайнай пенсіі, у гэтай краіне існуе агульная дадатковая пенсія, якая налічваецца з заробку з 15 «лепшых» гадоў працы. На транспарце пенсіянеры ездзяць за паўцаны, пры наведванні выставак, музеяў, тэатраў скідкі дасягаюць 20-70%.

З пералічанага — гэта далёка не ўсё, чым ашчасліві сваіх грамадзян сацыялізм па-шведску.

Але ж, каб праводзіць такую сацыяльную палітыку, неабходна мець у дзяржаўнай казне грошы. Тым больш што Швецыя — адзіная краіна ў свеце, якая на сацыяльныя патрэбы расходуе 42% унутранага валавога прадукту. Урад Швецыі не ўмешваецца ў сферу вытворчасці, і там пануе прыватнік. Але што датычыцца даходу грамадзян, то дзяржава трымае яго пад поўным кантролем, і грошы на сацыяльную палітыку бярүцца з падаткаў. І чым большы ў чалавека даход, тым вышэй падаткі. Падаткі ў Швецыі дасягаюць 50-80% ад даходу.

Пры такой сістэме пераразмеркавання падаткаў пралетарыят павінен быць задаволены, але не ўсё так проста. У Швецыі таксама існуе дэфіцыт на бясплатныя ці недарагія прадукты, паслугі, кватэры, віды матэрыяльнай дапамогі... Любы сацыялізм мае прыкладна аднолькавыя балючыя кропкі.

Былы прэм'ер-міністр Швецыі, які кіраваў краінай больш чым 20 гадоў (1946-69 гг.) Т. Эрландар растлумачыў: **«Чалавек павінен мець магчымасць прымяняць свае здольнасці для іншага, чым для барацьбы за нядрэнное існаванне. Адзінства імкненняў, павага да бліжняга, пачуццё дачынення да агульнай справы... таксама важныя для чалавечнага існавання, як і рост матэрыяльнага дабрабыту».**

Пасля распаду Саюза большасць савецкіх рэспублік кінулася ў капіталізм, а Беларусь да сённяшняга дня не можа развітацца з сацыялізмам. Нам страшна перадаць (а давядзецца прадаць) прыватнаму капіталу сродкі вытворчасці.

У Беларусі, як і іншых краінах СНД, ужо ёсць свае «абрамовічы». Але ад сваіх даходаў яны плацяць не намнога больш працэнт падаткаў, чым работнік з сярэднім заробкам. І што гэта за сацыяльная палітыка, калі наш мільярдэр карыстаецца тымі ж сацыяльнымі льготамі, што і самы бедны чалавек? Ды справа не толькі ў падатках, а і ў стане грамадства ў цэлым.

Уявім, што бальшавікі на заранку станаўлення савецкай дзяржавы аддалі б зямлю сялянам, а заводы — рабочым. І што — атрымалася б шведская мадэль сацыялізму? Падняўся б новы прыватнік, які і слухаць не хацеў бы пра «грамадства ўсеагульнага дабрабыту».

Усё намнога складаней.

Калі ў Швецыі закладваліся асновы будучай мадэлі развіцця, у Савецкім Саюзе праводзілася шырокая калектывізацыя — расправа з прыватнікам.

Сёння ў Кітаі наадварот. Сродкі вытворчасці аддалі ў прыватныя рукі, а пенсій не плацяць. Хоць пры ўладзе камуністы — рупліўцы за шчасце народа.

А ў Расіі пануе алігархічны капітал.

Шведскі шлях прыцягальны, і некаторыя аналітыкі лічаць, што яго лёгка можна выкарыстоўваць у іншых краінах.

Гэта не так. Штучна перанесці вопыт адной краіны на глебу другой даволі складана. У кожнай краіны свая гісторыя, традыцыі, менталітэт народа...

У Швецыі атрымалася, бо народ там вылучаецца самадысцыплінай, рацыяналізмам, імкненнем пазбегнуць канфліктаў... Парасткі «шведскага сацыялізму» закладваліся ў мінулых пакаленнях, калі пра сацыялізм і не чулі.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Крынічка
«Цякла тут з лесу невялічка
Травой зарослая крынічка».
Якуб КОЛАС.
Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81
№ 31 (410)

# Чаранкаванне парэчак



**Жнівень — гэта той месяц, калі трэба пачынаць чаранкаваць парэчкі для таго, каб замяніць некаторыя кусты на больш ураджайныя, з іншымі смакавымі якасцямі ці проста абнавіць свой сад.**

Першымі пачынаюць чаранкаваць парэчкі чырвоныя. Зрабіць гэта лепш у канцы жніўня — дакладней, у трэцяй дэкадзе месяца. А вось чорныя, залацістыя парэчкі, ёшту пачынаць чаранкаваць можна ў першай дэкадзе верасня.

Зразаецца чаранок даўжынёй 18 см, на якім павінны быць чатыры добра развітыя пупышкі. Верхні зрэз робіцца касым, ніжні — прамым, каб менш было выпарэння ў чаранка. На ўчастак, дзе вы збіраецеся пасадзіць чаранкі, уносіцца гной (не свежы, а пажадана перапрэлы) ці кампост. Зямля паліваецца. Чаранок пад нахілам у 45 градусаў заглыбляецца ў глебу такім чынам, каб на паверхі заставалася адна пупышка. Глеба прытоптваецца, зноў паліваецца і, каб зямля не трэскалася, мульчыруецца. Вясной, калі пачынаецца перыяд вегетацыі, пупышка прачынаецца, ідзе ў рост. Калі прырост дасягне 5—10 см, толькі тады трэба пачынаць падкормку азотнымі ўгнаеннямі — мачавінай альбо салетрай. Угнаенні лепш уносіць у вадкім выглядзе (запалкавы пачак угнаення на вядро вады). Пажадана ліць пад корань, але, калі раствор трапіў на лісцікі, абавязкова потым з лейкі паліць на расліну, каб змыць гэты раствор. Праз тыдні тры зноў правесці падкормку азотнымі ўгнаеннямі, каб даць магчымасць расліне падрасці. З сярэдзіны ліпеня падкормкі азотнымі ўгнаеннямі спыняюцца, бо трэба каб расліна за жнівень—верасень адраўнела: у такім выглядзе яна лепш перазімуе.

А калі вы не паспелі зрабіць чаранкаванне ўвосень, ці можна гэта зрабіць вясной? Спецыялісты лічаць, што можна. Але рабіць гэта трэба як мага раней, калі пупышкі яшчэ не кранулся ў рост. Часцей за ўсё тады яшчэ і мокра ў садзе, дзе-ніяе ляжыць снег, многа вады, таму зрабіць гэта больш складана, чым увосень. Але і тут можна знайсці выйсце.

У лютым—пачатку сакавіка нарэзаць чаранкі даўжынёй 18 см, павесіць на іх этыкеткі з назвай гатунку, потым звязаць у пучок, прычым ніжняя частка яго, якую потым будзем садзіць у зямлю, павінна быць роўнай (верхняя неабавязкова). Чаранкі перавярнуць роўнай часткай уверх, а няроўнай апусціць у снег (снег прытаптаць), прысыпаць вільготным торфам або пілавіннем (1—1,5 см). Такім чынам у снезе запавольваецца рост пупышак. У верхняй частцы за пэўны час з'яўляюцца карэньчыкі. Вясной, калі ў садзе крыху падсохне, у яшчэ вільготную зямлю гэтымі карэньчыкамі садзіце чаранкі. Многія садаводы лічаць, што лепш вырошчваць саджанцы самім і потым высадзіць іх на пэўнае месца. Чаранок акліматызуецца, прывыкае да глебы, а потым лепш прыжываецца.

# Расліны для зялёнага ўгнаення

**Віку яравую** высяваюць рана вясной як папярэдніка позніх культур і заворваюць у глебу зялёныя расліны да цвіцення. Можна высяваць віку яравую і ў другой палове лета, пасля ўборкі ранняй агародніны, і запраўць у глебу да маразоў.

**Віка азімая (касматая)** — бабовая расліна, узбагачае глебу азотам, арганічнымі рэчывамі. Віку азімую высяваюць увосень пасля збору асноўнай культуры. Высяваць можна радамі, а можа і ў роскід — так, напрыклад, як сеюць жыта. Запраўляюць насенне на глыбіню 1 см. Часта высяваюць у сумесі са злакамі, якія служаць падтрымкай для слабых раслін вікі. Спачатку высяваюць віку, а праз некалькі дзён — азімае жыта ці пшаніцу. Віка непатрабавальная да глебы, добра пераносіць нізкія тэмпературы, засуху і зацяненне. Аптымальныя тэрміны высявання гэтай расліны ў якасці сідэрату — жнівень—пачатак верасня. Каб у суровую зіму расліна не вымерзла, зялёную масу трэба запраўць у глебу позна ўвосень. Норма высеву вікі — 7—9 г на 1 кв. м.

Бывалыя агароднікі лічаць **баркун жоўты** вельмі перспектыўным сідэратам: гэта і кармавая культура, і меданос, і лепшы папярэднік для любой культуры. Ён добра расце на любых глебах, хіба толькі акрамя кіслых. У параўнанні з іншымі раслінамі баркун лепш ачышчае глебу ад нематоды, драцяніка і іншых шкоднікаў, па яго каранях вымываюца з глебы лішкі солязу. Як лічаць вучоныя, баркун жоўты лепш, чым іншыя расліны, уключае ў біялагічны кругазварот азот, фосфар і іншыя пажыўныя элементы. Гэты сідэрат на адной сотцы нарошчвае каля 300 кг зялёнай масы, і, заправіўшы яе ў глебу, не трэба клапаціцца пра гной.

❑ ❑ ❑

Аднагадовыя сідэраты заворваюць у глебу ў год пасеву, шматгадовыя — праз 1—2 гады. Тэрмін, які больш падыходзіць для заворвання зялёнай масы, — пачатак цвіцення. Ячмень і жыта заворваюць у стадыі каласавання. Заворванне сідэратаў праводзіцца на глыбіню 18—20 см, вясной — больш мелка.

# Меліса ў садзе і на стале

**Меліса лекавая (мядоўка, пчаліная трава, лімонная мята) выглядае даволі сціпла, затое ў яе шчодрая «душа». Яна ласкава дорыць нам прыемны лімонны водар, вітаміны групы В, С, каразін, арганічныя кіслоты, дубільныя рэчывы.**

Высушаную зялёную частку меліссы выкарыстоўваюць вельмі шырока. Яе можна дабаўляць да кітайскай, індыйскай, цэйлонскай, грузінскай, краснадарскай гарбаты. Эфект атрымліваецца цудоўны: напой быццам пранізаны прыемнымі пахамі і лекамі.

Акрамя ўсяго, зялёны ліст меліссы, яе кветкі — гэта яшчэ і прыправа. Да салаты, агуркоў, памідораў, перцаў і іншых культур, страў з рыбы і мяса. Не псуе стравы і пры нарыхтоўцы агуркоў і памідораў на зіму. Прымяняецца пры квашанні капусты.

Эфірны алей меліссы малатаксічны, валодае заспакаяльным дзеяннем. У людзей з сардэчнымі захворваннямі знікаюць прыступы тахікардыі, задышка, здымаюцца болі ў вобласці сэрца. Акрамя таго, меліса аказвае дабратворны ўплыў на страўнік, галаўны мозг, асабліва пры спазмах, галавакружэннях, шуме ў галаве, рэгулюе работу страўнікава-кішачнага тракту. А ўвогуле ў сярэдневяковай Еўропе меліса лічылася цудадзейным сродкам ад усіх хвароб.



Вось якая ўніверсальная расліна. Як жа яе размнажаць? Размнажаць мелісу лепш за ўсё насеннем і расадай. Яна любіць цяпло, сонца. На тлустых ці пясчаных глебах сеюць на глыбіню да 0,5—1 см. Адлегласць паміж радамі да паўметра.

Догляд — рыхленні і падкормкі. Асабліва выдатна рэагуе на азотныя ўгнаенні і развядзены (1:8) каравяк. Расліна не вытрымлівае марозу 25—30 градусаў. Здараецца, шкодзіць і больш лагодны тэмпературны рэжым. Таму на зіму пасадкі ўцяпляюць гноем, лісцем, торфам ці пілавіннем (слоем да 8—10 см).

## Парада садаводу

**Не трэба пераўгнойваць глебу вакол кустоў агрэсту, маліны і парэчак. Лепш зрабіць праполку і рассыпаць каля сцвалоў перагной альбо сухое бацвінне. Увосень няма патрэбы рыхліць глебу і вакол суніц — лепш прыгарнуць яе да кустоў. Толькі будзьце ўважлівыя, каб незнарок не засыпаць кропку росту.**

# «ЧОРНАЯ ЎДАВА»: ЛЁС ЦІ «СУПАДЗЕННЕ»?





**ЖАНЧЫН, двойчы ўдоў, і тых, хто пахаваў больш за двух мужоў, у народзе яшчэ называюць «чорнымі ўдовамі». Згодна з некаторымі вучэннямі, напрыклад, з кабалістыкай, у такіх жанчынах «жыве анёл смерці». Таму і адносна рана па незразумелай «чарзе», якой кіруе лёс, як па «канвееры», паміраюць тыя, хто іх кахаюць? І не важна, ці быў пры гэтым да смерці заключаны афіцыйна шлюб.**

Сярод «чорных» ёсць нямала знакамітых удоў. У прыватнасці, легендарная актрыса Галівуда Элізабэт Тэйлар. У яе, дарэчы, калі верыць біёграфам, было аж восем афіцыйных мужоў. А колькі тых, хто проста яе кахаў, зразумела, падлічыць немагчыма. У тым ліку і багачоў першай велічыні.

Альбіна Назімава, маскоўская мастачка і дызайнер, была замужам за вядомымі тэлевізійнымі вядучымі. Улада Лісцьева забілі ў 1995 годзе. Потым з Альбінай ажаніўся інтэлектуал, «зорка»тэлебачання Андрэй Разбаш. Ён таксама памёр у 2006-м, пражыўшы з жонкай гадоў дзевяць. Апошняя жонка Аляксандра Абдулава, прывабная брунетка Юлія, таксама «чорная ўдава». Да таго як жыла з Абдулавым, была жонкай, а потым і ўдавой сына кіраўніка вядомага расійскага інфармацыйнага агенцтва.

Асабістае аўтарскае назіранне: большасць вядомых «чорных удоў» чамусьці брунеткі!

## «Чорныя ўдовы»... «ядуць» мужыкоў

Ёсць аднайменныя павукі — чорныя (або паўднёвыя), і яны вельмі ядавітыя. Шмат гэтых павукоў жыве ў Амерыцы, але не толькі там. Цікава, што дарослыя павукі мужчынскага полу значна меншыя па памерах, чым самкі. Па некаторых звестках у два-тры разы. Цікава, што да пачатку XX стагоддзя гэты від павукоў меў розныя назвы. У тым ліку — і «ядавітая баба». Можа, яшчэ і таму, што самкі, калі вельмі галодныя і «кавалер» падчас інтыму ім не спадабаўся, ядуць сваіх «каханых». Яд гэтага павука, аказваецца, нават больш шкодны, чым у грымучай змяі.

Што тычыцца жанчын — «чорных удоў», якая тут аналогія? Вядома, калі не ўзгадваць гісторыі жанчын, якія спецыяльна забівалі сваіх мужоў, каб атрымаць спадчыну. Адна амерыканская пісьменніца нават напісала кнігу пра жанчын, якія забіваюць. У гэтай кнізе, акрамя ўсяго, аўтар канстатавала, што сярод жанчын серыйных забойцаў, менавіта «чорныя ўдовы» — самы распаўсюджаны тыпаж. Прычым яны звычайна пачынаюць забіваць ва ўзросце ад 25 гадоў. Любімая зброя — яд. Галоўная мэта — грошы.

У расійскім Новасібірску, як кажуць, прагрымела у свой час гучная гісторыя пра жанчыну, якая забіла аж трох блізкіх ёй мужчын. Пра гэтую забойцу ў спадніцы шмат пісалі расійскія выданні і федэральнага ўзроўню. І што цікава, ні ў адным выпадку забойстваў яна не прызнала сваёй віны: маўляў, першыя два мужы самі напароліся на нож...

Можна наогул не верыць у экстрасэнсаў, містыку. Але ўжо навукова даказана, што ў чалавека, жывёлы ёсць энергетыка, вакол цела чалавека існуе не бачная звычайнаму воку аўра. Па меркаваннях магаў, энергетыка ў «чорных удоў» адмоўная, «знешні слой» іх аўры знаходзіцца быццам бы ў «цёмным» пакрыве, праз які яны ўцягваюць станоўчую энергію людзей, блізкіх да іх. Інакш і быць не можа.

Зусім не абавязкова тое, што будуць пакутаваць, напрыклад, дзеці «чорных удоў». Апошнія «харчуюцца» «чужой» энергіяй прадстаўнікоў іншых родаў.

Вядомы від адпаведнага радавога праклёну, калі на ўвесь жаночы род канкрэтнай сям'і насылаецца ліха. «Покрыва», як і праклён можна «зняць» пры звароце па дапамогу да знахароў.

Вернік, зразумела, адправіцца ў царкву. Дарэчы, калі вера шчырая, жанчына будзе прымаць свой няпросты лёс, як волю Бога, а не слухаць расказы знахароў аб нейкіх праклёнах і іншым.

Бадай, не буду потым спрачацца з чытачамі, калі напішу, што пры інтымных, блізкіх стасунках паміж мужчынам і жанчынай, акрамя энергетычнага, ідзе абмен, зразумела, і на фізіялагічным узроўні. Аказваецца, ёсць даследаванні па інтымных пытаннях. У прыватнасці, наконт таго, што жаночы арганізм можа выпрацоўваць і адмоўныя «ферменты», якія адпаведна адмоўна ўплываюць на здароўе мужчыны. У такім выпадку мужчына быццам бы «атручваецца ядам», які патроху негатыўна ўплывае на адносна слабыя ўнутраныя органы мужчыны. І неўзабаве праз некалькі гадоў апошні памірае.

## «Чорныя ўдовы»... лепшыя нявесты?

Першы муж маёй знаёмай памёр, калі ёй было толькі за дваццаць. Ён загінуў у аварыі. Праз чатыры гады жанчына зноў пайшла ў ЗАГС. Праз тры пахавала другога мужа — пасля таго, як раптам спынілася яго сэрца.

З яшчэ адной «чорнай удавой» мяне некалькі гадоў таму пазнаёміў калега, які з ёй сустракаўся. Усё баяўся, што будзе трэцім... Пужала, што і ў яго, як у тых мужоў, спыніцца сэрца. І не ажаніўся. Жывы і зараз. І дай яму Божа яшчэ шмат гадоў жыцця.

Ведаю жанчыну, яшчэ зусім маладую ўдаву, дачка якой ужо некалькі гадоў таксама ўдава. «Тэндэнцыя», радавы праклён?

Наконт таго, якіх мужчын выбіраюць сабе «патэнцыйныя» «чорныя ўдовы». Аказваецца, псіхолагі зрабілі захады, што «чорныя» хутчэй за ўсё выхоўваліся ў сем'ях, дзе жылі па прынцыпе матрыярхату. Мама камандавала татам. Таму і выбіраюць яны сабе ў якасці жаніхоў слабых духам мужчын, якія заўсёды змогуць быць у іх «пад абцасам». І пасля страты аднаго мужа міжвольна шукаюць сабе ў патэнцыйныя мужы такога ж, які заўсёды будзе залежаць ад іх настрою, волі.

Але... Калі дзяўчына ў першы раз выходзіць замуж, зразумела, ад свайго мужчыны, акрамя кахання на ўсё жыццё, чакае таго, каб ён стварыў ёй умовы для жыцця: зарабіў на кватэру, машыну і іншае. Але, як вядома, з цягам часу многае мяняецца ў патрабаваннях да жыцця.

Ды яшчэ здаўна ў нас існаваў «прынцып», што ўдава пасля смерці мужа спадзяецца на свае сілы, а не шукае матэрыяльнай і іншай дапамогі ад мужчын. Удовы часцей за ўсё ўжо маюць як мінімум тое ж жыллё, таму наўрад ці будуць шукаць сабе таго, хто б яе гэтым «шчасцем» забяспечыў. Ды і ў вар'яцкім сэксе ўжо, бадай, няма такой патрэбнасці, таму наўрад будзе падбіраць сабе «гіганта». Хутчэй за ўсё пажадае сабе мужа, які быў бы ёй амаль роўняй, але ўсё роўна знаходзіўся «пад абцасам». Ці можа быць такое? Напэўна.

Наўрад ці нармальны мужчына не пажадае не ажаніцца з удавой толькі таму, што ў яе такі «статус». Ці, можа, усё будзе думаць пра магчымасць стаць другім па ліку нябожчыкам? Ці асмеліцца мужчына, поўнасцю ўпэўнены ў сваіх пачуццях, стаць трэцім мужам «чорнай удавы»?

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**«Чорная ўдава» ці не — а якая розніца? Калі шчыра кахаеш, калі ад душы «прымаеш» яе дзіця (дзяцей), далёка да бабкі (чытай, знахаркі) не хадзі. Упэўнены, што ўзаемны клопат, Каханне (з вялікай літары) — гарантыі таго, што жыццё будзе доўгім, а шлюб моцным. Ці не так?**


«УТВЕРЖДЕНО»
Общим собранием Участников
ООО «Студенческий дом»
Протокол № 24 от 02.08.2011 г.

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ПЯТОГО ВЫПУСКА ООО «Студенческий дом» (далее – Краткая информация)

**1. Полное и сокращенное наименование Эмитента (на белорусском и русском языках)**

На белорусском языке:
полное: Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Студэнцкі дом»;
сокращенное: ТАА «Студэнцкі дом»;
на русском языке:
полное: Общество с ограниченной ответственностью «Студенческий дом»;
сокращенное: ООО «Студенческий дом».

**2. Место нахождения Эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)**

Республика Беларусь, 220040, г. Минск, ул. Восточная, 39, пом. 1Н, каб. №16, телефон: (017) 292-53-67, телефон/факс: (017) 292-53-67, e-mail: St-d@tut.by.

**3. Основные виды деятельности Эмитента**

Эмитент в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и своим уставом осуществляет следующие основные виды деятельности (в соответствии с общегосударственным классификатором «Виды экономической деятельности»):
- 74201 – Технический надзор в строительстве;
- 52630 – Розничная торговля;
- 93020 – Предоставление услуг парикмахерскими и салонами красоты;
- 70200 – Сдача помещений в аренду.

**4. Сумма зарегистрированного уставного фонда**

Уставный фонд Эмитента сформирован полностью в размере, предусмотренном Уставом: 7 802 000 (семь миллионов восемьсот две тысячи) белорусских рублей.

**5. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться бухгалтерская отчетность Эмитента в составе, определенном законодательством, и сроки ее публикации**

Бухгалтерская отчетность по итогам работы Эмитента за 2011 год и последующие годы подлежит публикации не позднее трех месяцев со дня окончания отчетного финансового года в газете «Белорусы и рынок».

**6. Место и время и способ ознакомления с Проспектом эмиссии Облигаций**

С более подробной информацией и Проспектом эмиссии Облигаций можно ознакомиться в течение срока размещения по адресу: Республики Беларусь, г. Минск, ул. Беломорская, 23, помещение 1Н, комната 1-1, ежедневно в рабочие дни (кроме субботы и воскресенья) с 10.00 до 13.00. Тел. 8 (017)-290-00-55. Ознакамливающееся лицо имеет право читать и делать выписки из предоставляемых в соответствии с настоящим пунктом документов.

**7. Дата, номер государственной регистрации Эмитента и наименование органа, его зарегистрировавшего**

Общество с ограниченной ответственностью «Студенческий дом» (далее – эмитент) зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом 07.09.2000 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100037170.

**8. Дата принятия решения о выпуске Облигаций и наименование органа, принявшего это решение**

Решение о выпуске займа жилищных Облигаций принято Общим собранием участников ООО «Студенческий дом», Протокол № 24 от 02.08.2011 г.

**9. Форма выпуска и вид Облигаций, объем эмиссии, количество, серия, номера:**

| | |
|---|---|
| Форма выпуска и вид Облигаций | Жилищные, бездокументарные, именные, неконвертируемые |
| Объем эмиссии | 1 312 000 000 (один миллиард триста двенадцать миллионов) белорусских рублей |
| Количество Облигаций | 205 (двести пять) штук |
| Серия, номера Облигаций | СД-5, №№ 000001-000205 |

**10. Номинальная стоимость Облигаций**

Номинальная стоимость одной Облигации составляет 6 400 000 (шесть миллионов четыреста тысяч) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный 1 (одному) метру квадратному общей площади жилья в создаваемых объектах недвижимости в составе объекта строительства «Многоэтажные жилые дома (не относящиеся к домам повышенной комфортности) со встроенными помещениями общественного назначения и подземными гаражами-стоянками в районе жилой застройки в квартале ул. Комаровское кольцо – пер. Восточный – ул. Корш-Саблина – ул. Восточная в г. Минске», без учета отделочных работ.

Общий эквивалент номинальной стоимости Облигаций составляет 205 (двести пять) квадратных метров.

Эквивалент номинальной стоимости Облигаций не подлежит изменению в течение срока обращения Облигаций настоящего выпуска.

**11. Цель выпуска Облигаций**

Выпуск Облигаций осуществляется в целях финансирования затрат, связанных с созданием объекта строительства, указанного в п. 10 Краткой информации, в т.ч. в целях замещения средств, привлеченных (привлекаемых) для создания указанного объекта, а также обеспечения рентабельности Эмитента, связанной с реализацией помещений объекта, завершенного строительством.

В период строительства временно свободные денежные средства, полученные от продажи Облигаций, Эмитент вправе использовать на финансирование иных мероприятий, связанных со строительством указанного объекта строительства.

**12. Период проведения открытой продажи Облигаций**

Датой начала открытой продажи Облигаций является 19 августа 2011 года.

Датой окончания открытой продажи Облигаций является 20 декабря 2013 года.

**13. Место и время проведения открытой продажи Облигаций**

Размещение Облигаций осуществляется путем открытой продажи физическим и юридическим лицам – резидентам и нерезидентам Республики Беларусь в соответствии с законодательством Республики Беларусь. До момента покупки Облигаций, покупатели должны заключить с Эмитентом договор в простой письменной форме, предусматривающий обязательства Эмитента по строительству жилых помещений владельцам Облигаций.

Размещение Облигаций осуществляется профессиональным участником рынка ценных бумаг ОАО «ДЕРЖАВАИНВЕСТ» на внебиржевом рынке. Для приобретения Облигаций инвесторы должны обратиться по месту нахождения Эмитента или ОАО «ДЕРЖАВАИНВЕСТ» (220013, г. Минск, ул. Беломорская, д. 23, ком. 1Н, пом. 1-1) в рабочие дни с 10 до 13 часов в течение срока проведения продажи Облигаций.

**14. Срок обращения Облигаций**

Срок обращения Облигаций устанавливается с 19 августа 2011 года и ограничивается 30 декабря 2013 года включительно и составляет 864 календарных дня.

**15. Дата начала погашения Облигаций**

Датой начала погашения Облигаций является 30 декабря 2013 года.

**16. Доход по Облигациям**

Доход по Облигациям не начисляется и не выплачивается.

**17. Условия и порядок досрочного погашения Облигаций**

В случае досрочного окончания строительства объекта недвижимости, указанного в п. 10 Краткой информации, а также в случае досрочного прекращения договора страхования (досрочном отказе страхователя от договора страхования) в соответствии с п. 22 Краткой информации, Эмитент может объявить о досрочном погашении Облигаций.

Досрочное погашение Облигаций осуществляется на основании письменного заявления владельца Облигаций с приложением выписки со счета «депо», подтверждающей наличие требуемого количества Облигаций и возможность их отчуждения (отсутствие ограничений, связанных с обременением Облигаций обязательствами).

Владелец Облигаций после начала их досрочного погашения вправе получить номинальную стоимость Облигаций. Возврат денежных средств при досрочном погашении осуществляется в срок не позднее 180 (ста восьмидесяти) календарных дней.

Прочие условия досрочного погашения устанавливаются по аналогии с порядком погашения Облигаций, установленным п. 18 Краткой информации.

**18. Порядок погашения Облигаций. Дата формирования реестра владельцев Облигаций**

Владелец Облигаций при погашении (досрочном погашении) Облигаций имеет право получить номинальную стоимость Облигаций либо жилое помещение, общая площадь которого соответствует эквиваленту номинальной стоимости принадлежащих ему Облигаций, выраженному в квадратных метрах.

Владельцы Облигаций определяются на основании реестра владельцев Облигаций. Эмитент формирует реестр владельцев Облигаций за 5 (пять) рабочих дней до даты начала погашения Облигаций.

В случае намерения получить при погашении Облигаций их номинальную стоимость владелец Облигаций должен не позднее, чем за тридцать календарных дней до даты начала погашения Облигаций в письменной форме уведомить Эмитента о таком намерении.

В случае наличия намерения получить при погашении (досрочном погашении) Облигаций соответствующее жилое помещение, начиная со дня начала погашения (досрочного погашения) Облигаций, владелец Облигаций и Эмитент подписывают акт приемки-передачи соответствующего жилого помещения.

При погашении (досрочном погашении) Облигаций владелец Облигаций должен перевести Облигации на счет «депо» Эмитента начиная со дня начала погашения Облигаций, но не позднее подписания акта приемки-передачи соответствующего жилого помещения.

**19. Условия и порядок приобретения Облигаций Эмитентом до даты начала их погашения**

В период обращения Облигаций Эмитент вправе осуществлять приобретение (выкуп) Облигаций у любого их владельца по цене, определяемой соглашением Эмитента и владельца Облигаций.

При неисполнении Эмитентом предусмотренных законодательством обязательств по договору, указанному в п. 13 Краткой информации, владельцы Облигаций вправе потребовать полного возмещения причиненных им убытков, а также возврата внесенных в оплату стоимости жилого помещения путем приобретения Облигаций денежных средств, проиндексированных путем умножения на коэффициент, определяемый отношением действующего на фактическую дату возврата средств индекса изменения стоимости строительно-монтажных работ, утверждаемого Министерством архитектуры и строительства Республики Беларусь по каждой области и г. Минску, к аналогичному индексу, действовавшему на дату перечисления владельцами Облигаций денежных средств в оплату стоимости жилого помещения путем приобретения Облигаций на счет Эмитента.

Индексы изменения стоимости строительно-монтажных работ определяются в соответствии с официально опубликованными данными Министерства архитектуры и строительства Республики Беларусь.

Возврат владельцам Облигаций денежных средств, внесенных в оплату стоимости жилого помещения путем приобретения Облигаций, в полном объеме осуществляется не позднее 6 месяцев с момента подписания акта о расторжении договора с Эмитентом (постановления суда – в случае отказа одной из сторон от подписания названного акта).

**20. Условия и порядок возврата средств инвесторам при признании выпуска несостоявшимся, запрете выпуска Облигаций Департаментом по ценным бумагам**

Решением о выпуске Облигаций не предусматривается признания выпуска несостоявшимся.

В случае запрета выпуска Облигаций, Эмитент обязан в течение одного месяца с момента получения от Департамента по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь уведомления о запрещении выпуска Облигаций возвратить инвесторам средства, полученные в оплату размещенных Облигаций, и письменно уведомить Департамент по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь о возврате указанных средств инвесторам в полном объеме.

**21. Дата и номер государственной регистрации Облигаций**

Облигации зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 16 августа 2011 года.

Регистрационный номер: 5-200-02-1183.

**22. Информация об обеспечении исполнения обязательств**

Исполнение обязательств по Облигациям обеспечивается договором страхования ответственности Эмитента, заключаемым с Закрытым акционерным страховым обществом «Кентавр», далее именуемым – «страховщик».

Согласно принятому обязательству страховщик выплачивает владельцу Облигации суммы в рамках предоставленного обеспечения, причитающиеся владельцу указанных Облигаций, в случае, если Эмитент не выполнит своих обязательств.

Общая сумма обеспечения обязательств составляет 1 312 000 000 (один миллиард триста двенадцать миллионов) белорусских рублей.

Обязательства страховщиком исполняются в валюте номинала.

Обеспечение по обязательствам Эмитента в отношении Облигаций действует в течение 3 (трех) месяцев с даты начала погашения Облигаций.

В случае, если договор страхования будет расторгнут ранее окончания срока обращения Облигаций, Эмитент производит замену обеспечения исполнения обязательств по Облигациям либо принимает меры по досрочному погашению данного выпуска.

**23. Оплата Облигаций**

Оплата Облигаций производится путем безналичного расчета в установленном порядке. Денежные средства на оплату Облигаций подлежат перечислению на расчетный счет Эмитента.

Размещение Облигаций осуществляется по цене, определяемой Эмитентом в зависимости от рыночной ситуации на момент продажи.

Внесение юридическими и физическими лицами денежных средств Эмитенту, а равно Эмитентом при выплате стоимости Облигаций их владельцам в предусмотреных эмиссионными документами случаях осуществляется в валюте номинала Облигаций.

**24. Порядок обращения Облигаций**

Обращение Облигаций осуществляется среди физических и юридических лиц на внебиржевом рынке в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

Для своевременного формирования депозитарием Эмитента реестра владельцев Облигаций сделки с Облигациями на вторичном рынке прекращаются за 5 рабочих дней до даты начала погашения Облигаций.

**Директор** **Войтенков Владимир Васильевич**

**Главный бухгалтер** **Климова Маргарита Октябрьевна**

